Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
3 ЛЮТАГА 2018 г. СУБОТА № 24 (28640)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Танцы для сур'ёзных людзей у міні-спадніцы

СТАР. 5



«Рэвізор» загаварыў на трасянцы

СТАР. 8



Чаго вы не ведалі пра нашых алімпійцаў

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

*«Віцебскай вобласці трэба сур'ёзна працаваць над павышэннем эфектыўнасці вытворчасці. За мінулы год рэгіёнам дасягнуты пэўныя станоўчыя вынікі: валавы рэгіянальны прадукт — 101,3 %, ёсць рост у прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Вялікая ўразлівасць Віцебшчыны ў тым, што ў вобласці нізкая эфектыўнасць вытворчасці, нізкі ўзровень заработнай платы. Таму асноўную ўвагу трэба ўдзяліць пытанням павышэння эфектыўнасці і зніжэння выдаткаў. У рэгіёне зараз многае робіцца ў АПК: будуюцца сучасныя МТФ, створаны аграхолдынгі. Віцебскія кадры разумеюць задачы, ёсць добры вопыт многіх пакаленняў. Важна гэта ўсё захаваць і прымнажаць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.02.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9744 | ▼ |
| Еўра | 2,4667 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0351 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0708 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Абрус са Святога



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У вёсцы Святое Жлобінскага раёна зімаваць застаецца няшмат жыхароў. Адна з тых, хто ніколі не пакідае сваю малую радзіму, — Зінаіда КУТОЎСКАЯ, старэйшына вёскі. У доўгія зімовыя вечары Зінаіда Мікалаеўна бавіць час за сваім улюбёным заняткам — вышыўкай абрусаў і ручнікоў.

■ Разумныя грошы

## БЕЗНАЯЎНЫ РАЗЛІК... ДЛЯ ЖОНКІ

Чаму мець шмат плацежных картак не заўсёды разумна

**Я, як, напэўна, і многія жанатыя мужчыны, амаль усе заробленыя грошы аддаю сваёй другой палове. Не, яна ў мяне не гультай, проста я, у адрозненне ад яе, не люблю хадзіць па крамах. Пастаянна здымаць са свайго пластыку буйныя сумы грошай і перадаваць іх жонцы — неяк не па-сучаснаму атрымліваецца. Выйсце — аформіць другую картку да свайго банкаўскага рахунку. Потым яшчэ адну і яшчэ... А абслугоўванне пластыку таксама каштуе грошай. У чым жа асаблівасці дадатковай карткі і ці адрозніваецца яе кошт ад асноўнай?**

### Бюджэтны варыянт

У самым пачатку сваіх сталых зносін з фінансамі вызначаем, што для аплаты паслуг і пакупак мы адкрываем разліковы рахунак і, як правіла, выпускаем асноўную картку (усё роўна, асабістую або зарплатную). Да гэтага рахунку амаль ва ўсіх выпадках можна замовіць дадатковую картку, каб хто-небудзь з членаў вашай сям'і мог карыстацца грашовымі сродкамі нароўні з вамі.

Калі вы хочаце аформіць дадатковую картку да свайго зарплатнага рахунку, то неабходна звярнуцца ў банк, паведаміць назву сваёй арганізацыі, зарплатнага праекта і тып карткі. Супрацоўнікі банка падкажуць, колькі будзе каштаваць менавіта ў вашым выпадку другая картка, а калі яна ўваходзіць у пакет паслуг — плаціць за яе не прыйдзецца. Таксама яна будзе бясплатнай, калі да свайго разліковага рахунку вы закажаце дадаткова ў Беларусбанку самую простую картку Белкарт-Стандарт.

СТАР. 4

■ Спажывец

## ПАЛІТО ПА ЦАНЕ АЎТО

Ці карыстаюцца попытам футры ў анамальна цёплую зіму?

**Калі хто памятае, навукоўцы прадказвалі, што гэтая зіма стане самай халоднай за апошнія сто гадоў. Пакуль прагноз не спраўдзіўся. Снежань і студзень ставілі тэмпературныя рэкорды — са знакам плюс. Для прадаўцоў футраў гэта, хутчэй, мінус. Як надвор'е паўплывала на попыт на іх тавар і хто з беларусаў можа дазволіць сабе норкавыя паліто — у нашым рэпартажы.**

СТАР. 7



На рынку — тавары з Расіі, Грэцыі і Кітая.

# Галоўнае багацце краіны

**Атрымаць дыплом аб прысваенні навуковай ступені з рук Прэзідэнта — напэўна, мара аб прызнанні амаль кожнага вучонага. Учора акадэмікі, членкары Нацыянальнай акадэміі навук (НАН) Беларусі, дактары навук, прафесары атрымалі дыпломы і атэстаты, якія пацвярджаюць іх новы статус.**

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка не абмежаваўся цырымоніяй афіцыйнага ўзнагароджвання. Пасля яе кіраўнік дзяржавы заклікаў навукоўцаў максімальна шчыра, не ўтойваючы існуючых праблем, расказаць, з якімі перашкодамі ім даводзіцца сутыкацца. Бо іх меркаванне — на вагу золата.

— Таленавітых, здольных людзей мы ніколі не страцім у Беларусі. Я за гэтым старанна сачу. Лёс чалавека для мяне галоўны пастулат. Асабліва таленавітага. Гэта здабытак нашай краіны. Мы не павінны яго страціць.

Па словах беларускага лідара, галоўнае багацце краіны — менавіта людзі. І асобны гонар выклікае навуковая эліта. У яе ўваходзяць найразумнейшыя і найбольш працалюбівыя спецыялісты. Званні доктара навук, прафесара, члена-карэспандэнта, акадэміка — гэта не толькі прызнанне заслуг, але і вялікі крэдыт даверу.

— Мы маем права чакаць ад вас адкрыццяў на мяжы немагчымага. У гэтым сэнс навукі. З гэтага моманту вы пачынаеце жыць у новай прафесійнай рэальнасці. А гэта значыць — працаваць і заўсёды адпавядаць свайму высокаму званню. Яшчэ больш важна пакінуць пасля сябе след у выглядзе сваіх вучняў.

Тэма таго, ці вырошчваюць масцітыя даследчыкі маладую змену, наколькі ў краіне выбудаваны сумленны і аб'ектыўны працэс прысвоення саіскальнікам вучоных званняў, гучала падчас сустрэчы не раз. Прэзідэнт падкрэсліў, што з'яўляецца прыхільнікам такіх падыходаў, якія забяспечаць аб'ектыўнасць і вылучаць з ліку вучоных самых вартых. Асабліва недапушчальна, калі прысутнічае, напрыклад, блат.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што дзяржавай нямала зроблена для развіцця айчыннай навукі. Так, падрыхтаваны шэраг заканадаўчых актаў, накіраваных на павышэнне сацыяльнага статусу навуковых работнікаў і стварэнне спрыяльнага асяроддзя для інтэлектуальнай дзейнасці. Па словах кіраўніка дзяржавы, гэтыя рашэнні мусяць стаць добрым стымулам для актывізацыі навуковай дзейнасці, дадуць магчымасць больш поўна раскрыць таленты вучоных і прыцягнуць моладзь у сферу.

— Мінулы год быў вельмі важны для Беларусі. Ён паказаў, што наша краіна гатова зрабіць першы крок у пабудове інтэлектуальнай эканомікі, эканомікі будучыні. І мы яго зрабілі, — заявіў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што на ІІ З'ездзе вучоных прыняты доўгатэрміновы стратэгічны дакумент — праграма развіцця навукі да 2040 года. І менавіта вучоным трэба будзе ажыццяўляць гэтыя ідэі.

Прэзідэнт заклікаў навукоўцаў шчыра казаць аб праблемах — і быў пачуты. Вучоныя дзяліліся тым, што іх хвалюе. Хібы ў заканатворчым працэсе, псіхалагічная падрыхтоўка айчынных спартсменаў і яе ўплыў на канчатковы вынік, развіццё медыцыны, хіміка-біялагічнай сферы... Напрыканцы сустрэчы Уладзімір Гусакоў, старшыня Прэзідыума НАН Беларусі, падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за тое, што Акадэмія навук існуе. «Гэта дзякуючы ім яна існуе», — адказаў Прэзідэнт, паказваючы на прысутных навукоўцаў.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# Доўгая дарога дамоў

**Учора на Радзіму вярнуўся Вячаслаў Качура — апошні з ліку беларускіх грамадзян, якіх прымусова ўтрымлівала ў Лівіі са жніўня 2011 года адна з так званых рэвалюцыйных брыгад. У аэрапорце яго сустракалі сын і дачка, прадстаўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства і журналісты. У палоне ён знаходзіўся больш за шэсць гадоў. Усе гэтыя гады праблема заставалася прадметам увагі беларускага боку. Вызваленне Вячаслава Качуры стала магчымым дзякуючы мэтанакіраваным упартым намаганням і садзейнічанню сяброў Беларусі з многіх краін.**

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў падзячныя пасланні Кіраўніку Чачэнскай Рэспублікі Расійскай Федэрацыі Рамзану Кадыраву і Наследнаму прынцу Абу-Дабі, намесніку Вярхоўнага галоўнакамандуючага Узброенымі сіламі Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў шэйху Мухамеду бен Заіду аль-Нахаяну за асабісты ўклад і садзейнічанне ў вызваленні беларускага грамадзяніна Вячаслава Качуры, які сілаю ўтрымліваўся доўгія гады ў Лівіі, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«Успамінаючы нашу сустрэчу ў Мінску 25 верасня 2017 года і Вашы абяцанні прыкласці са свайго боку неабходныя намаганні для хутчэйшага вызвалення грамадзяніна Беларусі, я хачу падзякаваць Вам за асабісты ўклад у справу вяртання Вячаслава Качуры на Радзіму. Аказанае Вамі садзейнічанне ў такім важным для Прэзідэнта кожнай краіны пытанні абароны жыцця, здароўя і інтарэсаў суайчыннікаў за мяжой з'яўляецца наглядным прыкладам тых дружалюбных, брацкіх вузаў, якія звязваюць народы Беларусі і Расіі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы ў падзячным пасланні Рамзану Кадыраву.

У пасланні шэйху Мухамеду бен Заіду аль-Нахаяну Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і ся-бе асабіста выказаў словы шчырай удзячнасці за аказанае садзейнічанне. «Гэты крок добрай волі з боку Вашай Высокасці з'яўляецца яркім прыкладам адданасці мудрага кіраўніцтва Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў каштоўнасцям гуманізму і справядлівасці і заслугоўвае глыбокай павагі», — адзначыў Прэзідэнт.

«Вы зрабілі для нашага грамадзяніна нешта большае, чым вяртанне страчанага права на свабоду. Вы падарылі яму магчымасць убачыць за доўгія гады разлукі сваіх родных і блізкіх, уз'яднацца з сям'ёй, набыць упэўненасць у заўтрашнім дні», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што Беларусь з'яўляецца надзейным партнёрам ААЭ і высока цэніць адносіны дружбы і даверу, якія склаліся паміж краінамі. «Мы заўсёды будзем рады працягнуць руку дапамогі эмірацкаму народу, калі ўзнікне такая неабходнасць», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У ПАР ВЫРАТАВАЛІ 955 ШАХЦЁРАЎ, ЯКІЯ АМАЛЬ ДВА ДНІ ЗНАХОДЗІЛІСЯ ПАД ЗЯМЛЁЙ

У Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы паспяхова завяршылася аперацыя па выратаванні 955 шахцёраў, якія аказаліся пад зямлёй пасля таго, як на шахце раптам адключылася электрычнасць. Гарнякі знаходзіліся пад зямлёй амаль два дні: з-за буры электрычнасць на залатым рудніку «Беатрыкс» адключылася ў сераду ўвечары пасля пашкоджання адной з вышак лініі электраперадачы. Электрыкі ўвесь гэты час спрабавалі аднавіць падачу электрычнасці да ліфтаў. Адзін з ліфтаў удалося запусціць раніцай у пятніцу, пасля чаго шахцёраў паднялі на паверхню, паведаміў мясцовы тэлеканал eNCA. Прадстаўнік кампаніі Sibanye-Stillwater, якой належыць руднік, заявіў, што шахцёры ніяк не пацярпелі.

### AMAZON СТАЎ САМЫМ ДАРАГІМ БРЭНДАМ У СВЕЦЕ

Самай дарагой гандлёвай маркай свету па версіі кансалтынгавай кампаніі Brand Finance стаў брэнд анлайн-рытэйлера Amazon. Кампанія Джэфа Безаса ўпершыню змагла абысці Google. Кошт брэнда складальнікі рэйтынга ацанілі ў 150,8 млрд долараў, што складае каля 2,5 % агульнага кошту ўсіх самых дарагіх брэндаў свету. Google з першага месца адкаціўся на трэцяе, саступіўшы не толькі Amazon, але і Apple. У першую дзясятку спіса таксама ўвайшлі Samsung, Facebook, тэлекамунікацыйны гігант AT&T, Microsoft, амерыканская тэлекамунікацыйная кампанія Verizon, гандлёвая сетка Walmart і кітайскі банк ICBC.

### У ДЖУНГЛЯХ ГВАТЭМАЛЫ ЗНАЙШЛІ ДЗЯСЯТКІ ГАРАДОЎ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ МАЙЯ

Не менш за 60 тысяч будынкаў цывілізацыі майя, схаваных у джунглях, выявілі навукоўцы на поўначы Гватэмалы. Сярод аб'ектаў, знойдзеных з дапамогай аптычнага датчыка з самалёта, — руіны дамоў, палацаў і пірамід, шырокіх дарог, рэзервуараў для вады і арашальныя каналы, умацаваныя паселішчы і шырокія дарогі. Знаходка стала буйным прарывам у археалогіі майя і можа казаць аб тым, што на гэтай тэрыторыі некалі пражывала да 10 мільёнаў чалавек. Атрыманыя вынікі сведчаць пра тое, што цывілізацыя майя на піку свайго развіцця была супастаўная з такімі складанымі культурамі, як Старажытныя Грэцыя ці Кітай.

### СУРОК ФІЛ НАПРАРОЧЫЎ ДОЎГУЮ ЗІМУ



Філ прадказаў яшчэ шэсць тыдняў зімы. Пра гэта паведамляе USA Today. Кожны год 2 лютага сурок па мянушцы Філ з амерыканскага горада Панксатоні дае прагноз наконт таго, наколькі доўгая акажацца зіма. Калі жывёла, выходзячы з норкі, убачыць свой цень, то наступныя шэсць тыдняў будуць халодныя, а калі не — цёплыя. Гэтым разам Філ убачыў свой цень. Дарэчы, упершыню дзень сурка адзначылі ў 1887 годзе.

## Ва ўрадзе

# Выйдзем на тавараабарот з Грузіяй у 200 млн долараў?

**Прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ сустрэўся з першым віцэ-прэм'ер-міністрам — міністрам эканомікі і ўстойлівага развіцця Грузіі Дзмітрыем КУМСІШВІЛІ. Яны абмеркавалі вынікі сумеснай працы, а таксама перспектыўныя кірункі далейшага супрацоўніцтва. Гэта сустрэча мае высокую важнасць у сувязі з падрыхтоўкай візіту Прэзідэнта Беларусі ў Грузію, які запланаваны на найбліжэйшы час. Таксама ў сталіцы адбылося пасяджэнне міжурадавай беларуска-грузінскай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве, падчас якога дэталёва абмеркавалі магчымасці для нарошчвання тавараабароту.**

Паводле слоў Андрэя Кабякова, Грузія для нашай краіны з'яўляецца адным з найважнейшых партнёраў на Каўказе. Прэм'ер-міністр акцэнтаваў увагу на вялікай колькасці сфер, у якіх сёння ўзаемадзейнічаюць дзве дзяржавы. Гэта і прамысловасць, і сельская гаспадарка, і нафтахімія, і фармацэўтыка, гуманітарнае супрацоўніцтва. «Мы паказалі нядрэнную дынаміку ўзаемнага тавараабароту: сёлета будзе больш за 100 млн долараў. Кіраўнікі дзяржаў паставілі задачу ў 200 млн долараў, таму мы ў сярэдзіне шляху», — дадаў Андрэй Кабякоў.

Ён выказаў надзею, што грузінскія партнёры ўжо змаглі ацаніць «швейцарскія цягнікі па беларускіх цэнах», маючы на ўвазе пастаўкі ў Грузію тэхнікі «Штадлер». «Грузавая, сельскагаспадарчая тэхніка, нафтахімічная прадукцыя — гэта тое, што мы можам прапанаваць, і тое, што, мяркуем, можа быць запатрабавана на вашым рынку. Мы лічым, што сумесная рэалізацыя буйных праектаў — гэта магчымасць для далейшага росту нашых адносін», — сказаў Андрэй Кабякоў. Таксама ён дадаў, што беларускі бок гатовы падключыцца да рэалізацыі планаў Грузіі па сур'ёзнай мадэрнізацыі жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Створана сумесная беларуска-грузінская вытворчасць ліфтавага абсталявання, якая ўжо выйграла тэндэр у Казрэці. «Але мы мяркуем, што гэта толькі пачатак. Мы з вамі гаварылі пра тое, што кропка бясстратнасці ліфтавай гаспадаркі — каля 250 адзінак у год», — нагадаў Андрэй Кабякоў. Паводле слоў прэм'ер-міністра, таксама вядзецца работа па рэалізацыі разліву беларускай і грузінскай алкагольнай прадукцыі на прадпрыемствах Грузіі і Беларусі. Добрыя перспектывы мае і супрацоўніцтва ў аграрнай сферы. Андрэй Кабякоў адзначыў зацікаўленасць грузінскага боку ў набыцці беларускай выратавальнай тэхнікі. «Наша сумесная работа ў Баржомскай цясніне летась, з аднаго боку, сама па сабе была няпростая, з другога боку, паказала магчымасці беларускай тэхнікі. Мы гатовыя з прапановай добрага фінансавага механізму на досыць канкурэнтных умовах прадаставіць адпаведную тэхніку і навучыць яе выкарыстоўваць», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў.

Падчас пасяджэння міжурадавай беларуска-грузінскай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве **намеснік прэм'ер-міністра Міхаіл РУСЫ** адзначыў, што за апошнія некалькі гадоў беларуска-грузінскія адносіны набылі ўстойлівы характар і дынамічна развіваюцца. «Вынік 2017-га дазваляе гаварыць пра тое, што гэты год мы скончым з рэзультатам у 126—127 млн долараў. Яшчэ год добра папрацаваць — і трэба выходзіць на пастаўленыя задачы ў 200 млн долараў. Агульныя падыходы ўжо знойдзеныя», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер. Міхаіл Русы таксама падтрымаў прапанову стварыць рабочыя падгрупы па розных кірунках для павышэння эфектыўнасці ўзаемадзеяння.

У сваю чаргу першы віцэ-прэм'ер-міністр — міністр эканомікі і ўстойлівага развіцця Грузіі Дзмітрый Кумсішвілі адзначыў неабходнасць далейшага актыўнага ўзаемадзеяння для павышэння тавараабароту паміж Беларуссю і Грузіяй. «Маючы адбыцца візіт Прэзідэнта Беларусі ў Грузію вельмі важны для нас. Некалькі гадоў таму, калі ваш Прэзідэнт прыязджаў у нашу краіну, быў дадзены істотны імпульс развіццю супрацоўніцтва. Хацелася б, каб да новага візіту было закладзена як мага больш сумесных ініцыятыў для далейшага развіцця нашых двухбаковых адносін», — рэзюмаваў ён.

Па выніках пасяджэння Міхаіл Русы адзначыў, што дзве дзяржавы будуць актыўна развіваць супрацоўніцтва ў сферы гандлю, АПК і турызму. «З мэтай развіцця турызму па абодвух напрамках неабходна разгледзець пытанне арганізацыі новых авіямаршрутаў», — сказаў віцэ-прэм'ер. Разам з тым ён звярнуў увагу на пытанні лагістыкі, у сувязі з чым міністэрствам транспарту дзвюх дзяржаў даручана вывучыць тыя маршруты, па якіх дастаўляюцца тавары, а таксама новыя напрамкі для таго, каб працаваць на Грузію і з пляцоўкі гэтай краіны прасоўваць тавары сумеснай вытворчасці. «Акрамя таго, для папулярызацыі нашых тавараў мы абралі такі кірунак, як стварэнне беларускіх гандлёвых сетак у Тбілісі і іншых гарадах. Мы прынялі рашэнне, каб аналагічныя сеткі ў найбліжэйшы час былі створаны ў Беларусі. Беларусы таксама павінны мець доступ да грузінскіх тавараў», — дадаў віцэ-прэм'ер.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

# «БЕЛЛЕГПРАМ» ПАКАЗАЎ БУДУЧЫНЮ АЙЧЫННАЙ МОДЫ

**Паказ-прэзентацыя калекцый адзення «Погляд у будучыню. Новыя магчымасці лёгкай прамысловасці Беларусі» адбыўся ў сталічнай Нацыянальнай школе прыгажосці. На мерапрыемстве прысутнічалі кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава, старшыня канцэрна «Беллегпрам» Мікалай Яфімчык, кіраўнікі тэкстыльных і швейных прадпрыемстваў краіны, дызайнеры.**



Фота БЕЛТА.

Свой погляд на моду і дызайн у калекцыях прадставілі вядучыя беларускія прадпрыемствы лёгкай прамысловасці. Таксама былі прадэманстраваны калекцыі адзення французскага дызайнера з беларускімі каранямі Юрыя Ката і дызайнера-кансультанта канцэрна «Беллегпрам» Людмілы Лабковай.

Па словах Мікалая Яфімчыка, паказ у першую чаргу быў запланаваны не як дэманстрацыя модных тэндэнцый, а як рабочая прэзентацыя. Старшыня канцэрна адзначыў, што ў час паказу былі прадэманстраваны не толькі эксклюзіўныя распрацоўкі дызайнераў, але і тыя рэчы, якія ўжо знаходзяцца ў прамысловай вытворчасці і продажы. «Беларуская лёгкая прамысловасць зрабіла значны крок наперад. Напрыклад, калекцыя Людмілы Лабковай толькі што вярнулася з Мілана. Гэта сведчыць аб тым, што беларускія ідэі цікавыя ў Італіі. Перспектывы ў нашай прадукцыі вельмі добрыя. Якасць тканіны высокая. Нашы прадпрыемствы ўмеюць з ёй працаваць. Дэталі некаторых з прадстаўленых узораў неўзабаве будуць выкарыстоўвацца ў прамысловых калекцыях. У цяперашнім паказе былі напрацоўкі, якія абсалютна новыя і ніколі раней не выпускаліся. Па цане мы таксама канкурэнты», — рэзюмаваў Мікалай Яфімчык.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■ «Славянскі базар у Віцебску»

# І ЗОРКІ З АРКЕСТРАМІ

**У дырэкцыі самага маштабнага на постсавецкай прасторы фэсту расказалі пра тое, чым здзівіць XXVII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Ён пройдзе з 12 па 16 ліпеня. Дадатковыя мерапрыемствы, як і заўсёды, запланаваны да адкрыцця і пасля закрыцця.**

## Кустурыца прыедзе. А Белучы?

Напэўна, многія могуць запытаць: ну што новага можна на «Базары» ўбачыць? За столькі гадоў каго толькі з артыстаў і калектываў там не было! Высветлілася, што сёлета рыхтуюцца прыняць «базарных навічкоў», але ж якіх!

У прыватнасці, у Летнім амфітэатры ўпершыню пацешаць публіку Эмір Кустурыца і яго «The No Smoking Orchestra» («Аркестр, які не курыць»), музыкант і кампазітар Горан Брэгавіч з «The Wedding & Funeral Band» («Вясельны і пахавальны аркестр»). Цікава, што спадар Кустурыца возьме ўдзел у паказе свайго фільма «На млечным шляху». У карціне, як вядома, знялася Моніка Белучы. Зразумела, прыхільнікі яе творчасці і прыгажосці былі б рады і яе прыезду...

Раней ніколі не выступаў у Віцебску і рок-гурт «Мумій Троль», які, безумоўна, збярэ поўную залу галоўнай канцэртнай пляцоўкі.

**Кіраўнік дырэкцыі фестывалю Аляксандр СІДАРЭНКА** на прэс-канферэнцыі перыядычна інтрыгаваў і «адбіваўся» ад назойлівых пытанняў наконт таго, хто яшчэ з зорак будзе ўдзельнічаць у фэсце. З таямнічай усмешкай падкрэсліваў, што «сюрпрызы будуць». Маўляў, усё раскажа, але не сёння...

## Даўно чакаюць цыркачоў

Добра, што ў арганізатараў заўсёды шмат цікавых ідэй, яны адкрытыя і для прапаноў. У прыватнасці, прапрацоўваецца магчымасць правесці цыркавы міні-фестываль.

Чацвёрты раз правядуць фестываль вулічнага мастацтва «На сямі вятрах». І зноў на вуліцах і плошчах Віцебска адбудуцца інтэрактыўныя праекты вулічных тэатраў, музыкантаў, перформераў, артыстаў і лялечных тэатраў . Дарэчы, у гэтым годзе першы маленькі — пяцігадовы — юбілей у праекта «Лялечны квартал».

Больш стане падзей і падчас традыцыйнага «Дня моладзі». Эпіцэнтр гэтага праекта — плошча Перамогі. Там плануюць арганізаваць тое, чаго раней не было, значна пашырыцца геаграфія ўдзельнікаў.

## Падары «Базар» блізкім!

З 1 лютага пачаўся продаж падарункавых сертыфікатаў наміналам у 10, 20, 30, 50 і 100 беларускіх рублёў. Абмяняць іх на білеты можна будзе з 23 лютага па 18 ліпеня. Як разважае дырэктар фэсту, сертыфікаты, бадай, — самы лепшы падарунак каханым, родным, бо тыя змогуць самі выбраць нешта для прыемных уражанняў.

Рэалізацыя білетаў на праекты фестывалю будзе праходзіць у тры этапы. Першыя паступяць у продаж 23 лютага. Старт другога этапу продажу білетаў на ўсе праекты ў Летнім амфітэатры запланаваны на 23 сакавіка. На трэцім этапе — білеты на праекты на іншых фестывальных пляцоўках. Дата будзе агучана дадаткова.

Пра падрабязнасці таго, якім будзе фестываль, «Звязда» яшчэ раскажа. Нагадаю, што Віцебск — сталіца фестываляў. І сёлета, працягваючы традыцыю супрацоўніцтва, планецца правесці IV Міжнародную канферэнцыю «Фестывальны рух. Традыцыі і інавацыі».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■ З нагоды

# Скрынінг — шанц на жыццё без раку

**Заўтра адзначаецца Сусветны дзень барацьбы з ракавымі захворваннямі. Праблема злаякасных новаўтварэнняў актуальная для ўсіх краін. Штогод у свеце рак дыягнастуюць у 14 мільёнаў чалавек.**

Беларусь адносіцца да краін з сярэднім тэмпам росту ракавых захворванняў. Паводле інфармацыі **загадчыка аддзела арганізацыі супрацьракавай барацьбы РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Паўла МАІСЕЕВА,** штогод амаль у 50 тысяч беларусаў выяўляюць злаякасныя новаўтварэнні. Летась ад анкалагічных хвароб у Беларусі памерла каля 17 тысяч чалавек.

— Можна пачуць выказванні, што нас паглынае ракавая чума, але я з гэтым не згодны, — адзначыў Павел Маісееў. — Важна найперш не тое, колькі чалавек захварэла, а колькі памерла. А смяротнасць ад злаякасных новаўтварэнняў у нас знаходзіцца на другім месцы пасля сардэчна-сасудзістых захворванняў. А ў такіх краінах, як ЗША, Канада, большасці краін Заходняй Еўропы яна выйшла на першае месца.

Дарэчы, спецыялісты сцвярджаюць, што няма доказаў, нібыта на рост ракавых захворванняў уплывае блізкасць Чарнобыльскай АЭС. Даказана пакуль такая сувязь з пухлінамі толькі адной лакалізацыі — шчытападобнай залозы.

Сярод прычын вялікай распаўсюджанасці раку спецыялісты называюць рост працягласці жыцця. Наша краіна — не выключэнне. Сярэдняя працягласць жыцця ў нашых жанчын складае 79 гадоў, у мужчын — 69. І чым старэйшы чалавек, тым бышэйшая рызыка захварэць на рак. Яшчэ адна прычына тоіцца ў нашым ладзе жыцця.

— Не сакрэт, што сёння ў нас не ў пашане фізічная актыўнасць і правільнае харчаванне. Затое шкодныя звычкі вельмі распаўсюджаныя, — кажа Павел Маісееў. — Трэба памятаць, што 70 % раку лёгкага наўпрост узнікае ад курэння. 40 % іншых пухлін таксама звязаны з курэннем, але апасродкавана. Невялікую колькасць, не больш за 7 %, складаюць тыя пухліны, якія маюць генетычную прыроду. Як бачым, многае залежыць ад прафілактыкі. Большасць рэкамендацый сусветных арганізацый накіравана менавіта на прафілактыку. Выдаткоўваць вялікія грошы на лячэнне запушчаных выпадкаў бесперспектыўна.

Як сцвярджаюць медыкі, 40 % ракавых пухлін можна папярэдзіць. Крыўдна, што дагэтуль у нашай краіне выяўляецца шмат так званых пухлін візуальнай лакалізацыі. Яны даступныя для выяўлення падчас агляду ўрача. Пры гэтым амаль 13 % беларусаў, хворых на рак, памірае менавіта ад такіх новаўтварэнняў. Гэта сведчыць пра тое, што многія хворыя не звяртаюць увагу на свой арганізм.

— Дагэтуль сустракаюцца жанчыны, якія прыходзяць на прыём да доктара з 3—4 стадыяй пухліны малочнай залозы. Гэтак жа сустракаюцца хворыя з ракам скуры, у якіх ледзь не штодзень на галаве ці тулаве прагрэсіруе пухліна, і яны з гэтым нічога не робяць. Многае залежыць ад саміх нас, ладу жыцця і нашай увагі да арганізма, — падкрэсліў Павел Маісееў.

## КАБ ПАПЯРЭДЗІЦЬ РАК

Спецыфічных супрацьракавых дабавак не існуе. А метады прафілактыкі такія ж, як і ў іншых агульнасаматычных захворванняў. Паводле слоў **загадчыка кафедры анкалогіі БелМАПА Аляксандра ЖУКАЎЦА,** даследаванні паказалі, што змяніўшы лад жыцця чалавека, можна на 40 % знізіць верагоднасць анкалагічных захворванняў. Яшчэ на 20 % зменшыць захваральнасць дапаможа лячэнне інфекцыйных хвароб. Як вядома, 15 % ракавых пухлін узнікае менавіта ад іх. Вірус папіломы чалавека выклікае рак шыйкі маткі, бактэрыя Хелікабактэр пілары — галоўны ўзбуджальнік гастрытаў і язваў страўніка, якія вядуць да раку, гепатыт В і С таксама прычына анкалагічных хвароб.

Аднак не ўсе хваробы можна папярэдзіць. Калі рак усё ж узнік, важна выявіць яго на нулявой, першай ці другой стадыях. 80 % такіх хворых папраўляюцца, а з некаторымі відамі пухлін, своечасова знойдзеных, шанцы папраўвіцца ёсць абсалютна ва ўсіх. У прыватнасці, гэта датычыць раку прастаты.

Паводле слоў **намесніка дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Сяргея КРАСНАГА,** з 2007 года ў Беларусі пачалі ўкараняць скрынінгавыя праграмы. Яны дазваляюць выявіць чатыры віды раку: шыйкі маткі, прастаты, тоўстай кішкі і малочнай залозы. Цяпер вядуцца даследаванні па новых скрынінгавых праграмах, якія дазволяць выяўляць рак страўніка і лёгкіх.

**Алена КРАВЕЦ**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## Стаўка рэфінансавання зніжаецца на 0,5 %

**Як паведаміе прэс-служба Нацыянальнага банка, з 14 лютага стаўка рэфінансавання зніжаецца з 11 % да 10,5 % гадавых, а стаўкі па пастаянна даступных і двухбаковых аперацыях падтрымкі ліквіднасці — з 12 % да 11,75 % гадавых.**

Рашэнне прынята праўленнем Нацбанка з улікам існуючага і прагнознага ўзроўню інфляцыі, адналенчага росту эканомікі, а таксама спрыяльных тэндэнцый на знешніх рынках. У паведамленні гаворыцца, што інфляцыя па выніках 2017 года паменшылася да 4,6 % з 10,6 % у 2016 годзе. Асноўны ўклад у запаволенне росту спажывецкіх цэн унесла базавая інфляцыя, якая ў 2017 годзе знізілася да 2,5 % (у 2016 годзе — 10 %). Прагназуецца, што ў найбліжэйшыя месяцы прырост спажывецкіх цэн складзецца ў межах 5 % у гадавым выражэнні.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Ратавальнік і ў водпуску ратавальнік

**Як важна бывае аказацца ў патрэбны час у патрэбным месцы. Асабліва калі ў тым месцы чалавеку неабходна дапамога.**

Менавіта так было ў Іванаўскім раёне, калі мясцовы жыхар выйшаў на возера каля вёскі Навінкі палавіць рыбу. 50-гадовага вяскоўца не спыніла вада пад нагамі, якая выступіла пры плюсавай тэмпературы. Ён ішоў па лёдзе і праз некаторы час праваліўся. Мужчына нават паклікаць на дапамогу не мог, бо глуханямы ад нараджэння. Але ўсё ж, як відаць, нарадзіўся пад шчаслівай зоркай. Бо побач з месцам здарэння аказаўся Мікалай Барычэўскі, камандзір аддзялення пажарна-выратавальнага паста вёскі Моталь.

Мікалай паведаміў пра чалавека, які праваліўся пад лёд, на пульт дзяжурнага ў Іванава, а сам пайшоў ратаваць рыбалова. З дапамогай таго, што трапілася пад рукі, ратавальнік акуратна выцягнуў небараку з праталіны. Гора-рыбака агледзелі медыкі і адпусцілі дадому. А старшы прапаршчык Мікалай Барычэўскі прадоўжыў свой водпуск, у якім знаходзіўся.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## Аварыя на Смаленшчыне

**У яе трапіў аўтобус з мінскімі нумарамі.**

Сем чалавек пацярпелі ў аварыі ў Смаленскай вобласці з удзелам рэйсавага аўтобуса, які ехаў з Мінска ў Маскву. Па інфармацыі Упраўлення дзяржаўнай інспекцыі бяспекі дарожнага руху па Смаленскай вобласці, паведамленне пра ДТЗ на 376-м кіламетры трасы М-1 паступіла амаль адразу пасля чатырох гадзін ранку. Згодна з папярэднімі звесткамі, кіроўца аўтамабіля Peugeot Boxer выехаў на сустрэчную паласу, дзе сутыкнуўся з аўтобусам з мінскімі нумарамі. У выніку апошні з'ехаў у кювет і перакуліўся. Падчас аварыі сем чалавек атрымалі траўмы, двух пацярпелых даставілі ў бальніцу, астатніх адправілі на амбулаторнае лячэнне.

## Стала дрэнна за рулём

**У сталіцы рэйсавы аўтобус уехаў у агароджу з-за таго, што ў кіроўцы адбыўся сардэчны прыступ.**

Здарэнне мела месца каля 13 гадзін на вуліцы Магілёўскай, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама. Аўтобус маршрута № 23 ехаў з боку вуліцы Жукоўскага ў напрамку вуліцы Талстога ў другой паласе. Як засведчылі пасажыры, у нейкі момант транспарт пачаў ссоўвацца лявей. Далей яны заўважылі, што кіроўца ў кабіне ляжыць на падлозе. Аўтобус наехаў на бардзюрны камень, а пасля — на металічную агароджу. Сутыкненняў з другім транспартам не адбылося, ніхто з пасажыраў не пацярпеў. Згодна з папярэдняй інфармацыяй, у кіроўцы здарыўся сардэчны прыступ, дапамогу яму аказваюць медыкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Што чакае судовую сістэму?

## Адзіны працэсуальны кодэкс і пераход на апеляцыю

**У Беларусі знізілася колькасць крымінальных спраў ды грамадзянскіх і эканамічных спрэчак. Пры гэтым павялічыўся аб'ём адміністрацыйных правапарушэнняў, у прыватнасці за дробнае хуліганства, крадзяжы і распіццё спіртнога ва неўстаноўленых месцах. Чакаецца, што ў краіне з'явіцца поўная версія адзінай інфармацыйнай сістэмы судоў агульнай юрысдыкцыі, а медыяцыю можна будзе прымяняць і ў крымінальных справах, паведаміў Валерый КАЛІНКОВІЧ, першы намеснік старшыні Вярхоўнага суда Беларусі.**

Летась у Беларусі на пазбаўленне волі было асуджана крыху больш як 12 000 асоб. З іх пяцёра — да пакарання смерцю, трое — да пажыццёвага зняволення. Разам з тым суды актыўна прызначалі такія крымінальныя пакаранні, як грамадскія работы, грашовыя штрафы, абмежаванне свабоды. Тым не менш больш як трэцяя частка ўсіх асуджаных — гэта асобы, якія здзейснілі рэцыдыў злачынства, што значна паўплывала на прысуджэнне пакарання праз пазбаўленне волі, заўважыў ён.

Прадаўжаецца работа па развіцці і ўкараненні ў практыку элементаў электроннай судовай вытворчасці, перадавых інфармацыйных тэхналогій. На сайце Вярхоўнага суда ўжо ёсць адпаведны раздзел, які выкарыстоўваецца ў асноўным для эканамічнага правасуддзя.

Да 2020 года плануецца завяршыць распрацоўку і ўкараніць поўную версію адзінай інфармацыйнай сістэмы судоў агульнай юрысдыкцыі, якая дазволіць істотна аблегчыць збор, апрацоўку і атрыманне інфармацыі, у тым ліку і для ўзаемадзеяння са СМІ.

Ужо летам пачне працаваць апеляцыйны парадак разгляду скаргаў і пратэстаў на судовыя рашэнні па грамадзянскіх справах, якія не ўступілі ў сілу, дадаў Валерый Калінковіч:

— Фактычна ў асноўных відах судаводства — крымінальным і грамадзянска-эканамічным — мы канчаткова пераходзім на апеляцыю. Гэта дазволіць у гэтых відах вытворчасці завяршаць разгляд справы па сутнасці і прымаць канчатковае рашэнне ўжо на ўзроўні суда другой інстанцыі. У крымінальнай і эканамічнай судовай вытворчасці гэта ўжо цяпер працуе ў большасці выпадкаў.

Будзе прадумвацца далейшая рэформа наглядной вытворчасці, гэта значыць пытанні перагляду судовых рашэнняў, якія ўступілі ў сілу, з пункту гледжання падстаў, на аснове якіх гэта будзе адбывацца, і тэрмінаў такой вытворчасці.

Працягваецца таксама распрацоўка палажэнняў адзінага Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса для ўніфікацыі разгляду грамадзянскіх і эканамічных спраў і спрэчак. У ім плануецца захаваць усё добрае і эфектыўнае, што цяпер ёсць у двух працэсуальных законах. І дадаць сюды тое, чаго не хапае і што неабходна ў судовым працэсе, у прыватнасці інтэрнэт-тэхналогіі і відэа-канферэнцыі бакоў.

Што датычыцца вытворчасці па банкруцтве суб'ектаў гаспадарання, плануецца прапрацаваць пытанне аб упарадкаванні ўдзелу ў гэтых працэсах эканамічных судоў, каб максімальна выключыць рызыку карупцыйнай дзейнасці і павысіць адказнасць антыкрызісных кіраўнікоў за вынік іх дзейнасці.

**Ірына СІДАРОК.**

## Прыемная навіна

# Кошт дзяржрэгістрацыі для юрасоб зніжаны на 20 %

**Гэта прадугледжана Указам № 29 «Аб падаткаабкладанні», паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнага камітэта па маёмасці.**

Указам прадугледжана вызваленне сёлета ад падатку на дабаўленую вартасць абаротаў па рэалізацыі ў Беларусі работ па тэхнічнай інвентарызацыі незарэгістраваных эксплуатаваных капітальных пабудоў, ізаляваных памяшканняў, машына-месцаў і землеўпарадкавальных работ у дачыненні да зямельных участкаў, на якіх такія аб'екты размешчаны. У 2018 годзе юрасобы вызваляюцца таксама ад дзяржпошліны за выдачу (афармленне) дакументаў на зямельныя ўчасткі, на якіх размешчаны гэтыя незарэгістраваныя капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні). Гэтыя льготы распаўсюджваюцца на адносіны, якія ўзніклі з 1 студзеня 2018 года.

Сёння ў краіне праводзіцца сістэмная работа па завяршэнні афармлення дакументаў на дзяржуласнасць нерухомай маёмасці, якая эксплуатавалася да 2003 года. Урадам прымаюцца меры па завяршэнні дзяржаўнай рэгістрацыі гэтай маёмасці да 2020 года. Так, зарэгістраваны ўсе зямельныя ўчасткі, выдзеленыя лесагаспадарчым установам для вядзення лясной гаспадаркі. У Брэсцкай, Гомельскай і Магілёўскай абласцях завершана рэгістрацыя зямель сельскагаспадарчага прызначэння. Зарэгістравана 98,5 % капітальных пабудоў, ізаляваных памяшканняў, якія знаходзяцца ў рэспубліканскай уласнасці, 70 % — у камунальнай, гаворыцца ў паведамленні прэс-службы Дзяржкамітэта па маёмасці.

**Сяргей КУРКАЧ**



# БЕЗНАЯЎНЫ РАЗЛІК... ДЛЯ ЖОНКІ

## Пластык сярэдняга ўзроўню

Мы разгледзім варыянт выпуску дадатковай карткі да вашага асабістага рахунку, гэта значыць не зарплатнага. Калі вы хочаце даць доступ да сваіх грошай бацькам, дзецям або жонцы (!), можна лёгка заказаць другую картку да рахунку. Часцей за ўсё яе выпуск і абслугоўванне таннейшыя, чым у асноўнай, а тэрмін дзеяння не залежыць ад тэрміну першай карткі. Магчымасці дадатковай карткі нічым не адрозніваюцца ад стандартных умоў пластыку.

Самы просты варыянт — картка БелКарт-Прэміум-Maestro ад Белаграпрамбанка. Каштуе гэты пластык два рублі, калі афармляць як дадатковую, выпускаецца на тры гады. MasterCard Unembossed і Visa Electron аналагічна. Пластык Visa Classic, MasterCard Standard — абыдзецца па восем рублёў, пры тэрміне дзеяння тры гады.

Напрыклад, у Беларусбанку можна ўзяць больш прадстаўнічыя БелКарт-Прэміум-Maestro і Visa Electron у рамках клуба «НАСТАРТ». Заяўка ва ўстанове банка будзе каштаваць 10 рублёў, а афармленне дыстанцыйна — 9 рублёў. Тэрмін дзеяння — тры гады. Карта Maestro — 6 рублёў, а тэрмін дзеяння — 35 месяцаў. Visa Classic і MasterCard Standard — 15 рублёў на два гады, а 25 рублёў выпуск на 35 месяцаў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як правіла, кошт дадатковай карткі будзе адпавядаць цане асноўнай. У большасці банкаў картка Белкарт-Прэміум каштуе сем рублёў, Visa Classic — 20 рублёў, Visa Gold — 40 рублёў. Тэрмін дзеяння пластыку — два гады.

Выпуск дадатковых картак кліентам, якія знаходзяцца на зарплатным абслугоўванні, і членам іх сям'і ў асобных банках магчыма па ўсёй лінейцы на льготных умовах. Так БелКарт-Прэміум будзе каштаваць два рублі, Visa Classic — чатыры рублі, а Visa Gold — 12 рублёў.

## Важныя дробязі

Калі выбіраеш сабе (жонцы) дадатковую картку, трэба вельмі ўважліва чытаць умовы, напісаныя ў дагаворы дробным шрыфтам.

Напрыклад, асобныя банкі пішуць, што тэрмін дзеяння дадатковай карткі ўстанаўліваецца да тэрміну заканчэння асноўнай карткі. Работнік фінансавай установы не зверне ўвагу на гэты факт нават тады, калі вашай асноўнай картцы засталося жыць усяго пару месяцаў.

І яшчэ. Калі картка зарплатная, камісія не спаганяецца пры наяўнасці адкрытага ліміту авердрафту па заробкавым рахунку на дату выпуску дадатковай карткі. Але мне больш цікава, які працэнт у мяне забяруць па гэтай камісіі, таму што пластык у мяне не зарплатны. Але і гэта не ўсё. Асобныя банкі арганізавалі сэрвісны збор на абслугоўванне дадатковых картак — чатыры рублі ў месяц. Такі залаты атрымліваецца «пластык».

## Ануляваць картку

Адна справа даць жонцы дадатковую картку і падключыць sms-абвестку яе «пластыку» да свайго тэлефона. Я тады сапраўды ведаў, дзе і калі мая жонка траціць нашы грошы. Але, дадатковая картка праслужыла ўсяго год і, загадала доўга жыць (сцерлася магнітная паласа). Я адразу зрабіў трэцюю дадатковую, а вось пра другую, сапсаваную, забыўся. А дарма. Картка не працавала, але банку пра гэта было невядома. Таму з майго рахунку здымалася плата за абслугоўванне і за sms.

Дарэчы, ануляваць ужо непатрэбны «пластык» не так і проста. Мой банк праводзіў гэтую аперацыю толькі тры дні на тыдзень і толькі да абеду. Акрамя таго, неабходна было з'явіцца з карткай і пашпартам менавіта ў роднае аддзяленне банка і напісаць заяву пра тое, як выйшла, што картка сапсавалася.

## Дадатковая, але ўсё адно — асабістая

Успамінаю выпадак у краме. На касе раслічваецца мужчына. Набраў шмат тавару. Дае прадаўшчыцы картку жонкі, а ў адказ: «Гэта не ваша картка». Ён тлумачыць, што картка гэтая дадатковая, а грошы на ёй — яговыя. Але на пластыку выбітыя прозвішча і імя іншага чалавека (да таго ж — жаночае). Пашанцавала мужчыну, што прадаўшчыца яшчэ сігнальную кнопку не націснула. Інакш давялося б даказваць, што пластык не крадзены...

**Сяргей КУРКАЧ.**


**7 марта 2018 г. ИЗВЕЩЕНИЕ №2-А/2018**

**о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле**

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Срок аренды, (лет) | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку докум-ции, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Ул. Чечерской | 340100000002006048 | 0,0514 | Для строительства и обслуживания здания административного (парикмахерская, мастерская по бытовому обслуживанию населения) | Органичений в использовании не имеет | 5 | 6 388,80 | 300,00 | 3 531,92 |
| 2 | Ул. Владимирова, 17 | 340100000005007331 | 0,0007 | Для размещения киоска бытового обслуживания населения | Охранная зона сетей сооружений канализации | 5 | 115,62 | 10,00 | 2 629,08 |
| 3 | Район индивидуальной жилой застройки Романовичи (участок № 194 по генплану) | 340100000008002533 | 0,0810 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Охранная зона линий связи и радиофикации, сетей и сооружений канализации | 99 | 5 479,36 | 300,00 | 1 838,37 |

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданным эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. № 3–6)
3. **Аукцион состоится 7 марта 2018 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляестя этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY23912. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах).
Необходимые документы:
4.1 граждане – копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
4.3 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;
4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;
4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
4.6 представители иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.
4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность, и его копию.
5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации, осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.
6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».
7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 3 февраля по 5 марта 2018 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3–6**

**Контактный телефон 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.qomel.qov.by либо geodezcentr.by**

■ Спецыяльны рэпартаж

# Запальныя танцы і пад Despacito, і пад «Ласкавы май»

## Што адбываецца на дыскатэцы «для тых, каму за ...»

**Як спявае Верка Сярдзючка ў вядомай песні, якая стала негалосным гімнам усіх моцных і незалежных, «нават калі вам крыху за 30, ёсць надзея выйсці замуж за прынца...» Надзея, можа быць, і ёсць, а вось месцаў, дзе таго самага прынца можна сустрэць, не так шмат. А адказ напрошваецца сам сабой: лягчэй за ўсё знаёмствы завязваюцца менавіта ў танцы. Але ў нас чамусьці да гэтага часу не выкрыты стэрэатып, што дазволіць сабе «пайсці ў скокі» не па строга выверанах датах можа толькі моладзь. Лічбы ў пашпарце перайшлі на чацвёрты дзясятак? Прыйдзецца цярпліва чакаць юбілеяў ці чужых вяселляў. Мы вырашылі паглядзець на тых, хто з такім меркаваннем катэгарычна не згодны, і адправіліся на так званы вечар адпачынку.**



### Жанчыны — «у баявой гатоўнасці», мужчыны — у світарах

**ГОГАЛЕЎСКІ «Рэвізор», перакладзены на трасянку, — *эта* чысты *васторг*. Купалаўскі тэатр і, у прыватнасці, Мікалай Пінігін у мінулыя выхадныя прадставілі адаптаваную, хоць у цэлым адпаведную арыгіналу, бо дагэтуль актуальную, п'есу Мікалая Гогаля, якая на сцэне тэатра загучала на натуральнай сумесі рускай і беларускай моў. Апроч таго, што моўная «фішка» аказалася вельмі дарэчнай, вынаходлівай і смешнай — дзякуючы ёй гогалеўская камедыя атрымала яшчэ адзін гумарыстычны падмурак, — «Рэвізор» у Купалаўскім узбагаціўся іскрамётнымі рэжысёрскімі знаходкамі, выканаўся цудоўнымі акцёрскімі партыямі і ўзбуйнеў праз знакі сучаснасці. Тут табе і сумкі-шатландкі, і леапардавыя сукенкі, і «месяцовая паходка» Майкла Джэксана, а галоўнае — надзвычайная паралель з рэальнасцю. Карацей, спектакль *чудзесны*.**



Яшчэ да прэм'еры будучая пастаноўка атрымала выдатную рэкламу, хоць як такога наўмыснага ўсюдыіснага піяру, здаецца, не арганізоўвалася. Але ў прасторы толькі і размоў было, што пра новы спектакль у Купалаўскім, які рыхтуецца быць на трасянцы. І, трэба сказаць, гэта спрацавала. І не расчаравала, бо ўсе тры гадзіны спектакля ты смяешся, а калі не смяешся — зачароўваешся тымі дзеяннямі і гукамі.

Усё атрымалася ў найлепшых традыцыях найлепшага тэатра, што ў найлепшыя часы жыва і хутка рэагаваў на сучаснасць і перакладаў яе на мастацкія формы. На падмостках гучалі актуальныя жарты, бачыліся відавочныя адсылкі, ствараліся іранічныя сюжэты, а для публікі ў гэтым хавалася галоўная спакуса, бо ў тэатр яна прыходзіла, як на форум для абмеркавання. «Рэвізор» Мікалая Гогаля, на жаль, усё яшчэ застаецца ўзорам актуальнай камедыі, але «Рэвізор» Мікалая Пінігіна атрымаўся яшчэ больш прыцягальным: пры ўсёй безумоўнай дастатковасці чыстага тэксту п'есы пастаноўка ў Купалаўскім праз свае адаптацыі стала жывой і менавіта сучаснай, а не вечнай.

Як памятаем, у п'есе Гогаля Гараднічы збірае сваіх калег — чыноўнікаў, кожны з якіх мае свае «грашкі», — і паведамляе, што, згодна з канфідэнцыяльнай інфармацыяй, да іх накіроўваецца рэвізор. За рэвізора яны прымаюць сталічнага госця ў мясцовым гатэлі Хлестакова, які на гэты момант прасадзіў усе грошы, пачаў жыць у крэдыт і адчуў галодную нястачу. На шчасце для Хлестакова, чыноўнікі горада, наскрозь карупцыянеры, адзін за адным сталі прыносіць яму хабар, што малады чалавек спачатку прымае як даванне ў пазыку. Фантазіі чыноўнікаў падагрэла і п'янае трызненне Хлестакова, які перад дамамі — жонкай і дачкой Гараднічага — стаў хваліцца сваімі сувязямі і багатымі вечарынамі, якія насамрэч выдумаў. У выніку галоўны герой сабраў са ўсіх грошы, напісаў ліст сябру ў сталіцы, паабяцаў дачцэ Гараднічага ажаніцца і з'ехаў. Мары Гараднічага аб жыцці ў сталіцы і пакланенні яго высокаму чыну перапыніла чытка ліста Хлестакова і з'яўленне сапраўднага рэвізора.



Фота БЕЛТА.

У Купалаўскім ужо сам пачатак — нетыповы. Гараднічы, каб паведаміць калегам хвалюючую навіну, запрашае іх у лазню, дзе і пачынаецца дзеянне. Цягам усяго спектакля, дарэчы, пастаноўка абыходзіцца мінімальнымі, амаль аскетычнымі, дэкарацыямі, у якіх заўсёды дарэчна выдзяляюцца пэўныя элементы. Выкшталцоныя жырандолі, на адной з якіх Хлестакоў уздымаецца, гэта значыць «узвышаецца», над іншымі. Альбо ванна ў класічным стылі, патрэбная для ўвогуле цудоўна абыгранай сцэны з хабарамі: «рэвізор» прымае ванну, а кожны новы госць прыходзіць і падлівае яму ваду — улагоджвае. Аранжавыя будаўнічыя каскі спатрэбіліся для выдатнай паралелі з «аглядамі» дасягненняў: мясцовыя чыноўнікі стройнымі радамі з планам у руках паказваюць Хлестакову свае аб'екты. Сваю ролю сыгралі і леапардавыя сукенкі, у якіх эфектна з'яўляюцца жонка і дачка Гараднічага, паказваючы вульгарную безгустоўшчыну.

Трасянка, дарэчы, у спектаклі застаецца ўласцівасцю ў першую чаргу чыноўнікаў і ў нейкай ступені, напэўна, правінцыялаў. Толькі адзін персанаж — канешне ж, Хлестакоў са сталіцы — застаецца «ў трэндзе» і размаўляе на прыгожай літаратурнай беларускай мове. У гэтым імпэце — прымусіць персанажаў спектакля размаўляць на трасянцы — можна ўбачыць іронію, але яна не выглядае першамэтай. Руска-беларускі сплаў тут выкарыстоўваецца з нейкай паблажлівасцю, калі не любоўю. Прыкладна як у выбухной кнізе «Радзіва Прудок» Андруся Горвата, якую Купалаўскі тэатр ужо плануе выкарыстаць у будучым рэпертуары.

Шмат элементаў — у антуражы, у абыгрыванні, часам у інтанацыі (жонка Гараднічага мяняе манеру гаварыць, калі думае, што праз замужжа дачкі з'едзе ў сталіцу) — своеасабліва перадаюць ужо закладзеныя ў п'есу сэнсы альбо ствараюць дадатковыя, якіх у Гогаля не было. І гэта смешна, дарэчна, вынаходліва. Чыноўнікі, якія размаітымі спосабамі ўлагоджваюць Хлестакова, п'янага яго нясуць быццам у труне, выдаючы жаданае за рэальнае. А галоўным дадатковым сэнсам стала канцоўка — крыху працягнуты гогалеўскі сюжэт, які паказаў, што стала з Гараднічым і чыноўнікамі, калі ім абвясцілі аб прыездзе рэальнага рэвізора. Анёлкі вымелі іх нежывыя целы, што ўласна мне падаецца ўдалай гіпербалай і вельмі тонка іранічным і зразумелым фіналам. Хоць і не такім смешным, як у арыгінале.

Мікалай Пінігін свайго «Рэвізора» цудоўна вытрымаў у іскрамётным камедыйным кірунку ажно да другой паловы другога акта, калі гледачу прыходзіцца разняволіцца і аддацца прамовам. Глядзець новую пастаноўку Купалаўскага тэатра можна ўжо толькі дзеля задавальнення, праўда, вы выйдзеце з тэатра і зразумееце, што спектакль... працягваецца ■

■ Галерэя

# БОЛЬШ ЗА ДВАЦЦАЦЬ СЮЖЭТАЎ ЗА АДНЫМ СТАЛОМ

## Беларускі арт-праект з Венецыянскага біенале цяпер у Мінску

**Арт-праект «Стол», які прадстаўляў Беларусь на найпрэстыжнейшай міжнароднай мастацкай выставіцы — Венецыянскім біенале, а потым экспанаваўся ў парыжскай галерэі Francis Barlier, цяпер можна ўбачыць у Мінску. 1 лютага праект, аўтарамі якога з'яўляюцца мастак Раман Заслонаў, прадзюсар Віктар Лабковіч і рэжысёр Сяргей Талыбаў, быў паказаны гасцям на ўрачыстым адкрыцці ў Цэнтры сучасных мастацтваў на праспекце Незалежнасці.**

Гэта некалькі скульптурных і жывапісных твораў, але галоўнае — 32-хвілінная відэа ў цёмным пакоі, дзе за адным сталом адбываюцца каля дваццаці міні-сюжэтаў. Пасля апетытнага нацюрморта першым персанажам з'яўляецца сам мастак Раман Заслонаў перад сваімі інструментамі. Аказалася, жыццё, што мы праводзім за сталом, — надзвычай разнастайнае. Тут няспраўджаныя надзеі старога лавеласа, драма жанчыны, да якой не прыйшлі на спатканне, развагі аб жыцці, сляпое каханне і нават смерць перад такой жаданай вячэрай. Кожная замалёўка — у іх сыгралі беларускія акцёры тэатра і кіно — імкнецца трапна перадаць пэўныя, калі можна так іх назваць, жыццёвыя здарэнні. Усё гэта паказваецца ў нейкай пазачаснай візуальнай манеры. Хоць тут і з'яўляюцца знаёмыя цукеркі і некаторыя іншыя тыповыя рэчы ў рэквізіце, тым не менш адзенне, посуд, самі колеры ствараюць свет штучны, які аўтаматычна, з-за таго, што яго складана звязаць з сучаснасцю, адсылае да антуражу мінулага. Сваю ролю адыгрываюць гукі, якія падстройваюцца пад кожны новы сюжэт пры тым, што асноўны матыў застаецца нязменны.

Сам Раман Заслонаў — ён з'яўляецца аўтарам ідэі, але адзначае, што ўдзел трох аўтараў раўназначны, — расказаў, што задумка стварыць нешта падобнае з'явілася ў яго больш за пяць гадоў таму. Яго суаўтары далучыліся да «Стала», бо таксама зацікавіліся ідэяй, але ніхто з іх не меркаваў, што аднойчы іх твор выставіцца ў Венецыі ці Парыжы. Тое ж з акцёрамі і здымачнай групай, якія, па словах Рамана Заслонава, удзельнічалі ў рабоце «чыста з любові да мастацтва». Але ў выніку «Стол» перамог у конкурсе на стварэнне куратарскай канцэпцыі беларускага павільёна на 57-м Венецыянскім Біенале і паехаў прадстаўляць краіну на прэстыжнай міжнароднай выстаўцы.

«У Венецыі цікавасць да праекта праявілася з самага пачатку, — кажа Раман Заслонаў. — Камісія, якая прысуджае Залатога льва і на ацэнку нацыянальных павільёнаў мае недзе пяць хвілін, у нас затрымалася на пятнаццаць. Ім спадабалася, яны сказалі, што ў нас атрымалася стварыць рамантычную атмасферу, хоць звычайна яны нічога не кажуць, проста глядзяць і сыходзяць. Рэакцыя публікі была непрадказальнай, але па-свойму цікавай і часта станоўчай. Гэта было меркаванне не толькі гледачоў, але і прафесіяналаў — крытыкаў, куратараў, мастацтвазнаўцаў, арганізатараў біенале, што да нас траплялі. Усе былі здзіўленыя, што наш маленькі павільён на не самай прахадной вуліцы, на невялікім канале аказаўся быццам у цэнтры — за сем месяцаў выстаўкі гэта сфарміравалася ў агульнае меркаванне».




У Парыжы, дарэчы, месцам экспазіцыі стала галерэя Francis Barlier, якая знаходзіцца ў цэнтры горада, за дзвесце метраў ад Елісейскага палаца і за пяцьдзясят ад аўкцыённага дома «Крысціс», на вуліцы, дзе размяшчаюцца адны з вядучых галерэй свету.

У гісторыі праекта спрацавала магія лічбаў. Талерка, якая звычайна разбіваецца на пачатку здымак, у выпадку са «Сталом» была разбітая 1 лютага 2016 года, у гэты ж дзень праз год Раману Заслонаву паведамілі, што праект перамог у, назавём гэта так, нацыянальным конкурсе. Яшчэ праз год «Стол» распачаў сваю працу ў Цэнтры сучасных мастацтваў у Мінску.

«Для мяне і маіх суаўтараў сустрэча з мінскай публікай, напэўна, самая важная і хвалюючая, таму што мы — адсюль, тут вучыліся, тут выраслі, тут жывём. Стаўленне нашай публікі — гэта, напэўна, самае дарагое, што ў нас ёсць. І мы ёй давяраем, думаю, яе рэакцыя павінна быць прыкладна ў тым жа рэчышчы, што ў наведвальнікаў у Венецыі і Парыжы».

Арт-праект «Стол» будзе выстаўляцца ў Цэнтры сучасных мастацтваў да 27 лютага ■

Матэрыялы Ірэны КАЦЯЛОВІЧ.

■ Кінакрокі

# НА ЧЫМ ТРЫМАЕЦЦА «ТУМ-ПАБІ-ДУМ»?

## Новая карціна «Беларусьфільма» выйшла ў пракат

**У беларускай кінасферы гэта ўжо амаль мэйнстрым — абмяркоўваць, як так сталася, што прафесійны рэжысёр Вячаслаў Нікіфараў доўгі час, вымушана альбо не — невядома, працаваў і здымаў у Расіі. Цяпер майстар вярнуўся, заняў пасаду мастацкага кіраўніка «Беларусьфільма», на здымачнай пляцоўцы адсвяткаваў сваё 75-годдзе і нарэшце стварыў кіно ў Беларусі, на нацыянальнай кінастудыі. Гэтым кіно стала карціна з дзівакаватай назвай «Тум-пабі-дум» пра выхаванца дзіцячага дома Сан Саныча, які хоча самастойна знайсці сабе сям'ю і запісвае кароткае відэа, дзе прадстаўляе сябе і запрашае патэнцыйных бацькоў да перамоў. Фільм, што мяркуецца для сямейнага прагляду, выйшаў у пракат 25 студзеня, і пасля сеанса нам падалося, што «Беларусьфільм» зноў выпускае свой прадукт, быццам вымушаны яго выпускаць.**



Гісторыя самой карціны не такая «казачная», як складнае крочанне да хэпі-энду ў яе сюжэце. З інтэрв'ю са спадаром Нікіфаравым, якое «Звязда» апублікавала 13 студзеня, вынікае, што фільм «Тум-пабі-дум» пачалі здымаць, каб прымеркаваць яго да заканчэння шматгадовай рэканструкцыі кінастудыі (гэта здарылася ў лістападзе мінулага года). Рэжысёр згадаў прапушчаны падрыхтоўчы перыяд, недастаткова прафесіяналізм супрацоўнікаў, сціслыя тэрміны. Магчыма, неспрыяльных спадарожнікаў творчага працэсу было яшчэ больш. Тыя ж перыпетыі, толькі да хэпі-энду яны прывялі сумнеўнага.

Атрымалася тое, што атрымалася, — не да канца выразная гісторыя, затое з цікавым галоўным героем, без долі інтрыгі, затое з прыгожымі планамі Мінска, з надуманымі эмацыянальнымі ўспышкамі, затое з добрым канцом.

Сан Саныч, якога сыграў Арцём Венгеровіч з Адэсы, — незвычайны хлопчык. Ён рашучы, адукаваны, ведае некалькі моў, упэўнена сябе паводзіць, клапоціцца пра сваю падапечную Алеську, добра арыентуецца ў дарослым свеце. У гэты ж час мы знаёмімся з жанчынай — яе іграе Валерыя Арланава, — што пасля страты сям'і ў аўтакатастрофе задалася мэтай знайсці дзяўчынку, адзін у адзін падобную да яе дачкі. І ёсць яе адвакат Казановіч — гэтую ролю выканаў Павел Харланчук, — які бачыць апублікаванае відэа Сан Саныча і прапануе хлопцу здзелку. У выніку галоўны герой, разам з ужо сваім адвакатам Казановічам, імкнецца звесці Алеську з гераіняй Арланавай і ў гэты ж час сустракаецца з кандыдатамі на бацькоўства, сярод якіх зусім звычайныя сем'і, алігарх і італьянцы.

Па ўсім відаць, сюжэт не мае прэтэнзій на сур'ёзныя тэмы ці шматзначныя падтэксты — ад пачатку «Тум-пабі-дум» павінен быў стаць простай гісторыяй, у якой сіроцтва, асабістая трагедыя, генерацыя легкадумных мужчын не могуць успрымацца ў праблемным ці маральным кантэксце, а толькі служаць драматургіі забаўляльнага фільма. Імпэты аўтараў зразумець можна: карціна і праўда атрымалася глядацкай, толькі апроч гэтага яшчэ ненатуральнай, беспадстаўнай і нават фальшывай.

На жаль, з гэтых прычын паглыбіцца ў фільм, як у нейкі паралельны свет, а значыць прасякнуцца гісторыяй, не атрымліваецца. Нібыта драматычныя падзеі насамрэч не выклікаюць належных эмоцый: ні ад дзяўчынкі, якую прыёмныя бацькі вяртаюць у дзіцячы дом з-за яе хваробы, ні ад жанчыны, што страціла сям'ю, ні ад мастака, які раптам разумее, што ў яго ёсць сын, — ад няпростых, калі пачуць іх у рэальнасці, гісторый тут сэрца не сціскаецца.



Па-першае, таму, што сюжэт з яго шаблонамі, рамантычнымі героямі, прадказальнасцю, найгранымі інтанацыямі, занадта казачным дзіцячым домам і шчаслівым акружэннем галоўнага героя, дзе ўсё спрыяе крочанню да шчаслівай канцоўкі, не выклікае даверу. Пры тым што ён цалкам рэалістычны, у сэнсе сучасны, праз добра знаёмыя прыёмы і сюжэтныя павароты цяжка ўспрымаць карціну ўсур'ёз. Тым больш што глядзець яе прыходзіцца з вялікімі дапушчэннямі: закаханы ў гераіню Арланавай мужчына ненатуральна рамантычна аказваецца расчараваным у сабе мастаком, што малюе партрэты на вуліцы; а сама гераіня, канешне, любіць высокае мастацтва — оперу, асабліва Вердзі (у эпізодзе мільгае рэальная «Травіята», пастаўленая латвійцам Андрэйсам Жагарсам у Вялікім тэатры оперы і балета); у Сан Саныча ў дзіцячым доме ёсць тыповы, дарослы і мудры, сябар, а сам ён свабодна ходзіць па горадзе і займаецца сваімі справамі. І давер да апавядання зноў падточваецца.

Па-другое, нам прыходзіцца глядзець не фільм, а на тое, як ён зроблены: яго швы і крафтавасць — відавочныя; недасканаласці сюжэта, нестыкоўкі і нелагічныя сцэны выбіваюць з каляіны; шаблоны, якіх тут выкарыстана багата, не даюць забыць, што мы глядзім нешта створанае. Да таго ж у сваёй скіраванасці да лёгкага відовішча карціна аказалася надта фармальнай: сюжэт і яго плоская структура дамінуюць над пачуццямі, працэс расказу гісторыі дамінуе над яе сэнсам, эмоцыі называюцца, але для іх рэальнай прысутнасці не ствараецца ўмоў. Акцёры праходзяць перад камерай, дэманструюць перажыванні, агучваюць рэплікі, а персанажы пры ўсім гэтым застаюцца толькі функцыямі. Ненатуральныя рэакцыі, спешнасць у абыгрыванні некаторых сцэн, начытванне дыялогаў — эмоцый у гэтым, на жаль, не застаецца.

Таму фільм, зроблены ў цісках шаблонаў, рызыкуе пакінуць гледача не тое каб абыякавым, але халодным: добра, што паглядзелі, але можна было і не глядзець. У той час як карціна відавочна кіруецца інтарэсамі гледача, сам ён бачыць недасканаласці, якія няма дзеля чаго — выдатнай ідэі ці асаблівай прыгажосці — прабачаць. Ідэя тут адна — драма, перыпетыі, хэпі-энд, а візуальна «Тум-пабі-дум» зняты даволі проста, хіба што фільм разбавілі шматлікімі планамі Мінска з птушынага палёту, і гэта цудоўна.

Трэба сказаць, што якая ёсць карціна трымаецца на галоўным персанажы, сапраўды неардынарным героі, за рухамі якога цікава сачыць. З дарослымі, дзякуючы сваім розуму, знаходлівасці і кемлівасці, ён аказваецца на роўных і, канешне, мяняе іх жыццё. Глядзець «Тум-пабі-дум» прыйдзецца без асаблівай узрушанасці, але з-за непрадказальнасці Сан Саныча ўсё ж з цікавасцю.

Узнікае пытанне, чаму кінастудыі, улічваючы, што яна ўзялася за ў цэлым непатрабавальны жанр драмы з элементамі камедыі, маючы рэжысёра-майстра і бюджэтныя сродкі, зноў не ўдалося прадставіць яксны прадукт нават для той нішы, якую абрала на гэты раз. Недаравальныя ляпы, патуранне ў бок акцёрскай ігры і размыты — зноў з вялікімі дапушчэннямі — фінал прымушаюць думаць, што кінастудыя замест фільмаў пастаўляе на вялікі экран справаздачы аб зробленай рабоце.

На гэтую ж думку падштурхоўвае тое, што «Беларусьфільм» ігнаруе неабходнасць прасоўвання свайго кіно: «Тум-пабі-дум» выйшаў у пракат, а на яго рэкламу, напэўна, не хапіла часу і грошай, таму нават глядацкі прадукт шмат у чым праходзіць міма касы. Яго плакат, дарэчы, апроч таго, што падтрымлівае «традыцыю» самой карціны — ненатуральнасці і найгранасці, яшчэ і безгустоўны, а такія рэчы прывабіць даўно страчанага кінастудыяй гледача не здольныя.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

■ Выстаўка

# ЗГУРТАВАНЫЯ ПОЛЫМЕМ

## У Мінску адкрылася першая экспазіцыя Гільдыі керамістаў

**Старажытнае мастацтва керамікі на працягу тысячагоддзяў ішло з чалавецтвам плячо ў плячо. У адрозненне ад іншых відаў творчасці яно не забывалася на практычнасць дзеля знешняй эфектнасці, а ў сваім развіцці арганічна спалучала дэкаратыўны і ўтылітарны пачаткі. Пачэснае месца кераміка займае і ў беларускай культуры, як традыцыйнай, так і сучаснай. Менавіта таму ўтварэнне грамадскага аб'яднання «Беларуская гільдыя керамістаў» у канцы лістапада стала значнай падзеяй у нашай культурнай прасторы. Новая суполка амаль адразу зладзіла першую выстаўку, і цяпер з творчасцю беларускіх керамістаў можна пазнаёміцца на адмысловай экспазіцыі «Між рукамі і полымем» у мастацкай галерэі «Універсітэт культуры».**

Старшыня Беларускай гільдыі керамістаў Святлана Цап расказала, што ідэя стварыць саюз з'явілася яшчэ ў 2014 годзе падчас фестывалю «Кераміка Крэва». Наступным штуршком для ўз'яднання стаў удзел у праграме Еўрасаюза «Мост», якая дапамагла знайсці блізкіх па духу людзей у розных кутках Еўропы. Вызначальным аказалася падарожжа групы майстроў у Італію: пасля яго тэма ўтварэння гільдыі была ўзнятая ізноў, давялося прааналізаваць свае рэсурсы і магчымасці. Керамісты імкнуліся да юрыдычнай абароненасці, мелі патрэбу ў грантах і прэміях, якія цяжка атрымаць самастойна: творцам патрэбны вольны час на ўдасканальванне свайго майстэрства. «Быў момант, калі мы ледзь не аб'ядналіся з Беларускай гільдыяй майстроў і рамеснікаў, але адчулі, што здолеем арганізаваць асобны саюз», — падзялілася Святлана Цап.



**Таццяна Уруціна. «Камунікацыі».**

У першую чаргу аб'яднанне з'явілася дзеля таго, каб дапамагчы беларускаму керамічнаму мастацтву і керамістам у пошуках далейшых шляхоў развіцця. Адсюль вынікаюць розныя напрамкі дзейнасці: гэта і стварэнне новых навучальных устаноў для падрыхтоўкі керамістаў, і арганізацыя спецыялізаваных выставак і фестываляў, і ўсялякая падтрымка сяброў саюза. Сярод мэт гільдыі асобным пунктам пазначана стварэнне беларускага «Музея керамікі», якога ў Мінску дагэтуль няма.



**«Геаметрыя формы. Бычок» Сяргея Моўчана.**

— Ступень успрымання нашага мастацтва залежыць ад таго, наколькі актыўна людзі звяртаюцца да яго ў паўсядзённым жыцці. Трэба падымаць агульны ўзровень спажыўца, таму асноўная місія гільдыі — рабіць так, каб людзі ўлюбіліся ў кераміку, выкарыстоўвалі ўтылітарныя прадметы высокай якасці, — сцвярджае Святлана Цап. — Хацелася б зрабіць беларускую кераміку брэндам, які мае павагу і пакупніка за межамі краіны.

Пасля першай сумеснай выстаўкі можна сказаць, што творчае аб'яднанне спраўдзілася. Экспазіцыя «Між рукамі і полымем» прадэманстравала гледачам набыткі беларускіх керамістаў, разнастайнасць і шматграннасць іх мастацтва. Арганізацыя вельмі дэмакратычная: у сценах галерэі «Універсітэт культуры» знайшлося месца як для работ прызнаных майстроў, выкладчыкаў, членаў Беларускага саюза мастакоў і Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, так і для арт-аб'ектаў, створаных рукамі таленавітых маладых керамістаў.

Члены Гільдыі керамістаў пастараліся зацікавіць наведвальнікаў экспазіцыі, зрабіць сваё мастацтва зразумелым для спажыўца, таму ў межах выстаўкі ладзяцца творчыя сустрэчы і майстар-класы па ганчарстве, лепцы з гліны, роспісе керамічных вырабаў.

Убачыць дасягненні айчыннай керамікі на ўласныя вочы можна да 8 лютага.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ.**
**Фота Вікторыі АСКЕРА**

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом 1703 |
| **Продавец** | РУП «СМТ № 22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54. Тел.: + 375 (214) 48-30-01, 48-30-02, 48-30-03 |

**Лот № 1**

Имущество, в составе объектов недвижимости, оборудования, материалов, реализуемое одним лотом, в составе:

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Производственный корпус** | 4234,2 кв. м | 250/D-36006 |

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 23-2, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

**Обременения** Договор аренды. Подробная информация на сайте www.cpo.by

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Канализационная насосная станция ливневая** (Составные части и принадлежности: подземная часть, бетонное покрытие (2833 кв. м); ограждение (панели железобетонные) длиной 193,2 м; ограждение (кирпичи) длиной 9,6 м; дороги и проезды заводской территории наружной площадью 159 кв. м (покрытие бетонное; плиты железобетонные); ворота (1/2 часть) | 223,1 кв. м | 250/С-34540 |

Адрес: Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 23Г, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Внеплощадочная канализационная сеть ливневая** (Составные части и принадлежности: участок сети (трубопровод напорный от КНС (ливневой) до К1, колодец К1, трубопровод безнапорный от К1 до К) | 785 м | 250/С-39078 |

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12 в 0,3 км к востоку от д. Ксты, внеплощадочная канализационная сеть ливневая от КНС (ливневой) до колодца в г. Полоцке, р-н ул. Строительной, 30/6

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Сеть ливневой канализации** (Составные части и принадлежности: сеть ливневой канализации, в т. ч. трубопровод безнапорный, 87 колодцев, 12 дождеприемников, 25 выпусков) | 2160,5 м | 250/С-36840 |

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, в 0,3 км к востоку от д. Ксты, сеть ливневой канализации

**В состав лота входит следующее оборудование:**
Насос ФГГ 50/12,5, инв. № 05150, насос ФГГ 50/12,5, инв. № 05151, насос ФГГ 50/12,5, инв. № 05152, мост. кран 16-5к-22.5-16-У3, инв. № 02244, мост. кран 16-5к-22.5-16-У3, инв. № 02245, электротельфер канатный 0,5 т, б/н, насос «Гном», б/н

С перечнем материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Сведения о земельном участке:** Для обслуживания здания канализационной насосной станции предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 0,6463 га

**Начальная цена с НДС 20 %: 286 990,39 белорусских рублей**
Шаг аукциона: **14 349,52** белорусских рублей

**Порядок ознакомления по лоту № 1:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Абловацкий Петр Владимирович, ведущий механик, тел. 8 029 212-15-01

**Лот № 2**

Имущество, в составе объектов недвижимости, оборудования, материалов, реализуемое одним лотом, в составе:

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Цех деревообработки с пилорамой, сушилкой и котельной** (Составные части и принадлежности: навес, пристройка (навес), котельная, дороги и проезды заводской территории наружной площадью 2936 кв. м; забор (панели железобетонные) длиной 55,8 м; забор (панели железобетонные) длиной 11,8 м; забор (кирпичи) длиной 4,1 м; забор (панели железобетонные) длиной 8,2 м) | 2439,5 кв. м | 250/С-34934 |

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12Б, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Вагон-бытовка** (Составные части и принадлежности: терраса) | 164,4 кв. м | 250/С-34538 |

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12Б/2, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Дом-вагон «Нева»** | 164,8 кв. м | 250/С-34539 |

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12Б/3, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Тепловая сеть** (Составные части и принадлежности: участок тепловой сети: здания формовочного цеха, сооружений бытовых помещений (трубопровод тепловой сети от наружной стены здания котельной до наружной стены здания формовочного цеха; трубопровод тепловой сети от врезки (т. 1) до наружной стены сооружения бытового помещения производства участка № 3; трубопровод тепловой сети от наружной сети сооружения бытового помещения производства № 3 до наружной стены сооружения бытового помещения производства ПТК; участок тепловой сети от врезки (т. 2) до наружной стены сооружения бытового помещения) | 236,8 м | 250/С-39081 |

**Адрес:** Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12 в 0,3 км к востоку от д. Ксты, тепловая сеть

**В состав лота входит следующее оборудование:**

| Наименование | Инв. № | Наименование | Инв. № |
|---|---|---|---|
| Циклон бункерный | б/н – 3 единицы | Электровентилятор | б/н – 3 единицы |
| Котлоагрегат КВ-Т-0.5 | 40035 | Рама лесопильная Р-63-НБ | 44145 |
| Кран мостовой 16-5К-22.5 | 41057 | Рама лесопильная Р-63-НБ | 44146 |
| Улавливатель отходов УВП-1200 | 41603 | Улавливатель отходов УВП-1200 | 41604 |

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Обременения** Договор аренды. Подробная информация на сайте www.cpo.by

**Сведения о земельном участке:** Для обслуживания здания цеха деревообработки предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 1,1987 га. Ограничения (обременения) прав: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В, площадь 0,0223 га

**Начальная цена с НДС 20 %: 212 195,10 белорусских рублей**
Шаг аукциона: **10 609,75** белорусских рублей

**Порядок ознакомления по лоту № 2:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Мысник Наталья Васильевна, заместитель управляющего, тел. +375 29 516-32-23

**Лот № 3**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Элементы благоустройства** (Составные части и принадлежности: покрытие бетонное, ограждение (литер Б), ворота (литер б1), калитка (литер б2) | 1626 кв. м | 250/С-43117 |

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, в 0,3 км к востоку от д. Ксты, элементы благоустройства

**Сведения о земельном участке:** Для обслуживания сооружения элементов благоустройства с инвентарным номером 250/С-43117 предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 0,1714 га

**Начальная цена с НДС 20 %: 9 070,00 белорусских рублей**
Шаг аукциона: **453,50** белорусских рублей

**Порядок ознакомления по лоту № 3:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Абловацкий Петр Владимирович, ведущий механик, тел. +375 29 212-15-01

**Лот № 4**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Производственный корпус** (Составные части и принадлежности: общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные) | 5694,7 кв. м | 250/D-36976 |

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-1, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

**В состав лота входит следующее оборудование:**

| Наименование | Инв. № | Наименование | Инв. № |
|---|---|---|---|
| Кран мостовой электрический однобалочный Л-595 | 41070 | Кран мостовой 16-5К-22,5 | 41071 |

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Обременения** Договор аренды. Подробная информация на сайте www.cpo.by

**Начальная цена с НДС 20 %: 1 150 522,04 белорусских рублей**
Шаг аукциона: **57 526,10** белорусских рублей

**Лот № 5**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Производственный корпус** (Составные части и принадлежности: бетонносмесительный цех, склад готовой продукции; общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные) | 11371,2 кв. м | 250/D-36977 |

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-2, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Внутриплощадочная канализационная сеть** (Составные части и принадлежности: трубопровод, безнапорный, трубопровод, 45 колодцев, 4 дождеприемника, 17 выпусков) | 1707,0 м | 250/D-37674 |

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12, в 0,3 км к востоку от д. Ксты, канализационная сеть

**В состав лота входит следующее оборудование:**

| Наименование | Инв. № | Наименование | Инв. № |
|---|---|---|---|
| Кран мостовой 16-5К-22,5 | 41067 | Кран мостовой 16-5К-22,5 | 41068 |
| Кран мостовой 16-5К-22,5 | 41069 | Кран мостовой 16-5К-22,5 | 41058 |
| Трансформаторная подстанция ТМ-1000 | 40036 | Трансформаторная подстанция ТМ-1000 | 40037 |
| Подмости шарнирно-панельные | 07403 | Подмости шарнирно-панельные | 07404 |
| Формы для изготовления бетонных образцов 100*100 (5 компл. по 2 шт.) | 44102 | Формы для изготовления бетонных образцов 100*100 (2 компл. по 3 шт.) | 44106 |

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Начальная цена с НДС 20 %: 2 057 088,37 белорусских рублей**
Шаг аукциона: **102 854,42** белорусских рублей

**Лот № 6**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Складское помещение** (Составные части и принадлежности: рампа (59/100); общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные) | 970,8 кв. м | 250/D-36978 |

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-3, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

**В состав лота входит следующее оборудование:**

| Наименование | Инв. № | Наименование | Инв. № |
|---|---|---|---|
| Нивелир С-330 | 00081 | Нивелир С-330 | 00519 |
| Аппарат сварочный АС-150 | 42017 | Трансформатор ТДМ-403 У2 | 00482 |
| Инвертор сварочный ZX7-160 | 00480 | Блок снижения напряжения БСН1СУ3 | 00489 |
| Насос Гном 16*16 | 00487 | | |

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Начальная цена с НДС 20 %: 93 253,79 белорусских рублей**
Шаг аукциона: **4 662,69** белорусских рублей

**Лот № 7**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Складское помещение** (Составные части и принадлежности: рампа (41/100); общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные) | 683,5 кв. м | 250/D-36979 |

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-4, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

**Начальная цена с НДС 20 %: 86 820,00 белорусских рублей**
Шаг аукциона: **4 341,00** белорусских рублей

**Лот № 8**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Производственное помещение** (Составные части и принадлежности: общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные) | 551,6 кв. м | 250/D-36980 |

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-5, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

**Обременения:** Договор аренды. Подробная информация на сайте www.cpo.by

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Начальная цена с НДС 20 %: 66 384,39 белорусских рублей**
Шаг аукциона: **3 319,22** белорусских рублей

**Лот № 9**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Складское помещение** (Составные части и принадлежности: общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные) | 709,4 кв. м | 250/D-36981 |

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-6, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

**Обременения** Договор аренды. Подробная информация на сайте www.cpo.by

**Начальная цена с НДС 20 %: 80 820,00 белорусских рублей**
Шаг аукциона: **4 041,00** белорусских рублей

**Лот № 10**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Складское помещение** (Составные части и принадлежности: общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные) | 364,9 кв. м | 250/D-36982 |

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-7, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Начальная цена с НДС 20 %: 47 459,68 белорусских рублей**
Шаг аукциона: **2 372,98** белорусских рублей

**Лот № 11**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Складское помещение со стоянкой для автомашин** (Составные части и принадлежности: общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные) | 1093,7 кв. м | 250/D-36983 |

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-8, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

**Обременения** Договор аренды. Подробная информация на сайте www.cpo.by

**Начальная цена с НДС 20 %: 119 640,00 белорусских рублей**
Шаг аукциона: **5 982,00** белорусских рублей

**Лот № 12**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Складское помещение** (Составные части и принадлежности: общее благоустройство территории – забор (кирпич), две калитки, забор (металл), забор (панели железобетонные – 24,0 м и 280,9 м), дороги и проезды заводской территории, покрытие бетонное, плиты железобетонные) | 190,3 кв. м | 250/D-36984 |

Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12-9, в 0,3 км к востоку от д. Ксты

**Начальная цена с НДС 20 %: 24 960,00 белорусских рублей**
Шаг аукциона: **1 248,00** белорусских рублей

**Порядок ознакомления по лотам 4–12:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Мысник Наталья Васильевна, заместитель управляющего, тел. +375 29 516-32-32

**Лот № 13**

Имущество, в составе объектов недвижимости, оборудования, материалов, реализуемое одним лотом, в составе:

| Наименование (Назначение) | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Здание автовесовой (**Здание административно-хозяйственное) | 128,7 кв. м | 250/С-33939 |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12А/1, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |
| **Железнодорожные подъездные пути (**Сооружение специализированное железнодорожного транспорта) | 1542,4 м | 250/С-43216 |
| Составные части и принадлежности: подъездной путь, в т. ч. переезд, три водопропускные трубы; подъездной путь, в т. ч. повышенный путь; подъездной путь, в т. ч. стрелочный перевод; подъездной путь, в т. ч. стрелочный перевод | | |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12А, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |
| **Здание бытовых помещений (**Здание административно-хозяйственное) | 110,8 кв. м | 250/С-33938 |
| Составные части и принадлежности: дороги и проезды заводской территории наружной площадью 7735 кв. м; забор (металл) длиной 19 м; забор (панели железобетонные) длиной 71,7 м; забор (столбы ограждения 20 шт.); забор (панели железобетонные) длиной 181,8 м; забор (металл) длиной 2 м; калитка; забор (металл) длиной 98,1 м; 2 ворот; забор (металл) длиной 49,5 м | | |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12А/5, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |
| **Компрессорная с центральным тепловым пунктом (**Здание специализированное коммунального хозяйства) | 586,6 кв. м | 250/С-37672 |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12А, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |
| **Склад извести (**Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 65,8 кв. м | 250/С-33940 |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12А/2, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |
| **Склад цемента (**Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 68,3 кв. м | 250/С-34542 |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12А/4, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |
| **Склад цемента (**Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 67,8 кв. м | 250/С-34543 |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12А/3, в 0,3 км к востоку от д. Ксты | | |
| **Склад цемента** (Сооружение специализированное складов, хранилищ) | 61,3 кв. м | 250/С-39624 |
| Составные части и принадлежности: емкости | | |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, в 0,3 км к востоку от д. Ксты, склад цемента | | |
| **Здание теплогенераторной с котельной (**Здание специализированное коммунального хозяйства) | 157,4 кв. м | 250/С-33941 |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12А/6, в 0,3 км к востоку от д.Ксты | | |
| **Внеплощадочная водопроводная сеть хозпитьевая** (Сооружение специализированное водохозяйственного назначения) | 988 м | 250/С-39077 |
| Составные части и принадлежности: участок сети (5 трубопроводов напорных, 4 колодца) | | |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманском с/с, 12 в 0,3 км к востоку от д. Ксты от колодца в г. Полоцке, р-н ул. Строительной, 30/6 до колодца ВКЗ | | |
| **Внутриплощадочная водопроводная сеть** (Сооружение специализированное водохозяйственного назначения) | 867,2 м | 250/С-37673 |
| Составные части и принадлежности: трубопровод напорный, 11 колодцев, водопровод ввода | | |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12, в 0,3 км к востоку от д. Ксты, водопроводная сеть | | |
| **Сети связи и сигнализации** (Сооружение специализированное связи) | 750,1 м | 250/С-39080 |
| Составные части и принадлежности: участок линии электросвязи, участок линии телефонной канализации | | |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12 в 0,3 км к востоку от д. Ксты, сети связи и сигнализации территории УПТК | | |
| **Электросети** (Сооружение специализированное энергетики) | 658,4 м | 250/С-43214 |
| Составные части и принадлежности: два участка линии электропередачи | | |
| Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12А, в 0,3 км к востоку от д. Ксты, электросети | | |

**В состав лота входит следующее оборудование:**

| Наименование | Инв. № | Наименование | Инв. № |
|---|---|---|---|
| Весы автомобильные АЦ-40 | 47226 | Емкость под известь V-10 | 42076 |
| Установка мак-бетон (3 ед.) | 42067, 42068, 42070 | Трансформаторная подстанция ГКТП 10/04-160 кВт | 40014 |

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

**Сведения о земельных участках:**
- Для обслуживания сооружения железнодорожных подъездных путей с объектами хранения материалов предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 7,9371 га. Ограничения (обременения) прав: охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 В, площадь 0,5681 га
- Для содержания и обслуживания строений и сооружений производственной базы предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 0,8240 га
- Для обслуживания опоры линии электропередачи 10 кВ сооружения электросети продавцу на праве постоянного пользования предоставлены земельные участки пл. 0,0015 га (3 участка) и 0,0005 га

**Начальная цена с НДС 20 %: 188 807,37 белорусских рублей BYN**
Шаг аукциона: **9 440,37** белорусских рублей BYN

**Порядок ознакомления по лоту № 13:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 13.00 до 14.00. Ответственное лицо: Мысник Наталья Васильевна, заместитель управляющего, тел. +375 29 516-32-23

**Транспорт, спецтехника и оборудование, расположенные по адресу:** Витебская область, Полоцкий район, Экиманский с/с, 0,3 км к востоку от д. Ксты, в составе:

| Лот № | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 14 | 01153 | Автомобиль ГАЗ 31105 2224ВА-2 | 1 037,60 | 51,88 |
| 15 | 03454 | Дизмолот сваебойный МСДШ | 3 792,00 | 189,60 |
| 16 | 02500 | Захват 1ПТМ 791170г/п 10т | 288,00 | 14,40 |
| 17 | 02501 | Захват 2ПТМ 791170г/п 5т | 360,00 | 18,00 |
| 18 | 02218 | Кран башенный БМ-401П | 47 976,00 | 2 398,80 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Абловацкий Петр Владимирович, ведущий механик, тел: +375 29 212-15-01

**Оборудование, расположенное по адресу:** Витебская область, Полоцкий район, Экиманский с/с, 0,3 км к востоку от д. Ксты, в составе:

| Лот № | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год изготовления | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 19 | 31800 | Агрегат сварочный АДД 4002 М2, 2006 г. в. | 1 056,00 | 52,80 |
| 20 | 31801 | Агрегат сварочный АДД 4003, 2000 г. в. | 912,00 | 45,60 |
| 21 | 05063 | Дистилятор | 60,00 | 3,00 |
| 22 | 00086 | Измеритель дымности отработавших газов МЕТА-01 МП.01, 2009г. | 118,60 | 5,93 |
| 23 | 31798 | Сварочный аппарат JASIC ARC-140, 2007 г. в. | 9,60 | 0,48 |
| 24 | 05071 | Станок шлифовальный 3К-634, 1987 г. в. | 60,00 | 3,00 |
| 25 | 05061 | Стенд Р-770, 1991 г. в. | 309,60 | 15,48 |
| 26 | 05053 | Тележка Э-312, 1991 г. в. | 38,40 | 1,92 |
| 27 | 31816 | Трансформатор ТДМ-403 У2 | 64,80 | 3,24 |
| 28 | 41227 | Автоматический станок для резки штапика CKY-501 | 582,60 | 29,13 |
| 29 | 42020 | Выпрямитель V-160 S, 2006 г. в. | 68,00 | 3,40 |
| 30 | 42021 | Выпрямитель дуговой сварки ВДМ-1202С, 2007 г. | 273,00 | 13,65 |
| 31 | 47228 | Комплект тензометрии BSS-2t с индикатором Ci 6001 | 38,40 | 1,92 |
| 32 | 41080 | Линия по производству блоков из ячеистого бетона | 5 232,00 | 261,60 |
| 33 | 47197 | Машина испытательная ИП-100, 1994 г.в. | 1 011,60 | 50,58 |
| 34 | 40221 | Парогазогенератор ПГГ-2 | 864,00 | 43,20 |
| 35 | 40015 | Сварочный аппарат ВДМ-1201,1991г. | 184,80 | 9,24 |
| 36 | 41228 | Станок для зачистки углов профиля КТ-504/2, 2009 г. | 1 212,00 | 60,60 |
| 37 | 41044 | Станок настольно-сверлильный ВШ-029 | 696,00 | 34,80 |
| 38 | 41048 | Станок правильно-отрезной СМЖ 357К | 792,00 | 39,60 |
| 39 | 42069 | Станок точечной сварки МТ16/18, 1991 г. | 676,80 | 33,84 |
| 40 | 44095 | Станок шлифовальный 3К-1334 | 184,80 | 9,24 |
| 41 | 00464 | Трансформатор сварочный ТДМ-252 У2 | 74,40 | 3,72 |
| 42 | 41065 | Установка горизонтальная СМЖ-54А | 1 608,00 | 80,40 |
| 43 | 40024 | Установка прогрева бетона КТП ТО 80-86 У1, 1996 г. в. | 275,40 | 13,77 |
| 44 | 70223 | Шкаф металлический, 2000 г. в. | 53,60 | 2,68 |
| 45 | 8911 | Блок-контейнер | 729,20 | 36,46 |
| 46 | 8907 | Блок-контейнер «Душевые кабины женские» | 1 434,40 | 71,72 |
| 47 | 30004 | Нивелир НИ-3, зав. № 2359 | 84,00 | 4,20 |
| 48 | 00506 | Теодолит 3Т5КП | 302,40 | 15,12 |
| 49 | 04130 | Штукатурная станция СШ-6 | 1 128,00 | 56,40 |
| 50 | 04131 | Штукатурная станция СШ-6 | 984,00 | 49,20 |
| 51 | 00485 | Блок снижения напряжения БСН 1 СУ3, 2008 г. в. | 57,60 | 2,88 |
| 52 | 00486 | Блок снижения напряжения БСН 1 СУ3, 2008 г. в. | 57,60 | 2,88 |
| 53 | 01207 | Очиститель высокого давления Kranzle 800 TS T | 432,00 | 21,60 |
| 54 | 01138 | Станция прогрева бетона ТСД 3-80/0,38 У3 | 613,80 | 30,69 |
| 55 | 01139 | Станция прогрева бетона ТСД 3-80/0,38 У3 | 613,80 | 30,69 |
| 56 | 00490 | Трансформатор НТС 2.5У, 2011 г. в. | 31,20 | 1,56 |
| 57 | 00491 | Трансформатор НТС 2.5У, 2011 г. в. | 31,20 | 1,56 |
| 58 | 00463 | Трансформатор ТДМ-403У2, 2008 г. в. | 64,80 | 3,24 |
| 59 | 01129 | Установка для приготовления и выдачи раствора УПР-3 | 2 224,80 | 111,24 |
| 60 | 01130 | Установка для приготовления и выдачи раствора УПР-3 | 2 224,80 | 111,24 |

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY**

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 13.00 до 14.00. **По лотам №№ 19–27** ответственное лицо: Абловацкий Петр Владимирович, ведущий механик, тел. +375 29 212-15-01. **По лотам №№ 28–50** ответственное лицо: Зызников Виктор Иванович, заведующий базой, тел. +375 33 677-45-09. **По лотам №№ 51–60** ответственное лицо Свердлов Михаил Данилович, ведущий энергетик, тел. +375 29 516-31-13

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с **BY60BLBB30120191021390001001** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты: По лотам №№ 1–13**: не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи (если иное не предусмотрено договором купли-продажи).
**По лотам №№ 14–60** при цене продажи предмета аукциона в сумме до 49 999,99 BYN – срок оплаты не более **10** (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи. При цене продажи предмета аукциона в сумме свыше 50 000,00 BYN – срок оплаты не более **20** (двадцати) дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 13.01.2018 г.

Дата и время проведения аукциона: 14.02.2018 г. в 13.00 по адресу: РУП «СМТ № 22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54, актовый зал

**Дата и время окончания приема документов: 12.02.2018** до 17.00 по адресу: г. **Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**

**Контактные телефоны: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

■ Простая мова

# НАПІСАНАЕ — ЗАСТАЕЦЦА

**...Па крамах, жывучы ў вёсцы, маючы дойную кароўку ды закалоўшы якога парсючка, можна і не хадзіць. Жывучы ў горадзе, хочаш не хочаш, — мусіш. Найчасцей — подбегам — туды ды назад, бо часу вобмаль. Але ж зрэдку можна і гуляючы — пазіраючы ў шкло вітрын. У абутковай, напрыклад, на ўсе вокны «плакат»: маўляў, на першую пару зніжка 30 працэнтаў, на другую — усе 50! Люстры таксама на скідках. І бытавая хімія, і трыкатаж...**

**Але ж чэргаў пры гэтым — нідзе, нават заваду! Хоць быць — маглі б, бо не лішне ж і тое купіць, і гэта...**

**Як той казаў: купіць бы купіла, ды мала купіла, дзе апошняе — сінонім грошай.**

## Пад уражаннем

Хустачка — яна ж насатка, яна ж насоўка — рэч, можна сказаць, незаменная, а суслед — ды ў прастуду — яе дома забыўся. Па дарозе на заняткі прыйшлося новую купіць, амаль пяць рублёў аддаць.

— Гэта ж на старыя грошы амаль 50 тысяч, — здзівілася яго бабуля. — За што?

Назаўтра, не знайшоўшы адказу, рушыла ў найбліжэйшую краму: убачыла там майкі на сваіх мужчын — па чатыры рублі з капейкамі...

Купіла сем штук. Так, на ўсякі выпадак.

## Не кайся, рана ўстаўшы...

Ідэальны жыццёвы расклад: у 20 гадоў — мама, у 40 — бабуля, у 60 — прабабуля, у 80 — прапра...

Гэта, магчыма, пра Ірачку?

Яна з дарослай дачушкай надоечы ў Балгарыю ляцела, мытны кантроль праходзіла.

— Хто Іра, хто Лена? — разгарнуўшы пашпарты з амаль аднолькавымі фотаздымкамі і прозвішчам, спыталі ў іх строгія дзядзькі ў форме.

«Дзяўчаты» прадставіліся.

— Вы — матуля? — спыталі ў... дачкі.

— Я што, — залыпала вачыма дзяўчо, — так дрэнна выглядаю?

— Не, гэта я пакуль добра, — суцешыла матуля, продкі якой мелі рацыю, калі казалі: «Не кайся, рана ўстаўшы...». І нарадзіўшы.

## Была без радасці любоў...

Субота, ранак і рынак. Адна жанчына стаіць за прылаўкам — прадае агародніну, другая (нашмат маладзейшая) — «пралятае» міма.

— *Как дела?* — наўздагон пытаецца першая.

— *Еще не родила*, — адмахваецца другая, — *но уже развожусь.*

— *Почему?*

— *Ему водка дороже.*

...Жанчына раствараецца ў натоўпе, словы яе — у прасторы. Што ў астатку? Думкі — пра чужую, хай маленькую, але ж сям'ю, пра выбар, які зрабілі гэтыя двое, спачатку пажаніўшыся, а потым...

Была без радасці любоў, разлука будзе без маркоты?

Наўрад.

## Паасобку і разам

«Адна галава добра, а дзве лепш», «адзін дасужы, ды не дужы», «адно палена і ў печы не гарыць, а два і ў полі не гаснуць»... Відавочныя, здавалася б, рэчы, але...

Міхайлавіч, купіўшы хату ў вёсцы, каторы год ужо ездзіць туды адзін: сам даводзіць да ладу. Жонка — ні нагой.

Васілевіч таксама адзін: пасля інфаркту ўсур'ёз заняўся сваім здароўем — пастаянна ходзіць у басейн, ездзіць на роварах. Яго жонка з ранку да вечара глядзіць серыялы.

І Мікалаеўна адна — у кіно, у тэатрах, музеях, на выстаўках... Мужу, як ён сказаў, гэта зусім «неінцэрэсна».

...«Інцэрэсна» тут вось што: людзі гэта — немаладыя і як быццам павінны ведаць, што жыць разам — доўга ды шчасліва, а потым гэтак жа разам памерці шанцуе хіба адзінкам.

Значыць, паасобку — хто на гэтым свеце, хто на тым — яшчэ набудуцца.

Дык чаму б цяпер?..

Як казала незабыўная Скарлет О'Хара, я падумаю пра гэта заўтра.

## Жыццё як анекдот

Барысаўна — цётка дарослая. Ёй шэсцьдзясят — і нават пяць ужо. Шмат чаго ведае, шмат што ўмее, а ўжо язык падвешаны...

Прычым ён змалку гэтакі быў. Гады ў трычатыры малая недзе фразу злавіла «Серп і молат — смерць і голад». Пра што гэта, вядома ж, не разумела, проста скакала на адной назе ды ўвесь час паўтарала...

— Сціхні! — загадвалі бацькі. — Так нельга казаць.

Дзіця іх слухалася — хвілін з 15 пра серп маўчала, а потым зноў за сваё. Ды дзе — у мястэчку, на вуліцы...

Прыйшлося заперці яе ў хаце, нейкіх цацак надаваць, каб забылася, а то, крый божа, скандал — палітыку бацькам прышыюць.

Думаеце, гэта няпраўда? Тады...

На ўроку, дзе ішла гаворка пра Леніна, Васіль Быкаў — малы (сын вялікага) буркнуў пад нос: «Ільіч — стары хрыч».

Пра гэта яго пільная суседка па парце тут жа паведаміла настаўніцы, настаўніца — дырэктару школы, той (ці не той?) — «куды трэба»: у гаркам партыі і г. д.

Пісьменнік — нідзе ж не дзенешся — пісаў тлумачэнні.

## Гэта можа кожны...

Глухі не пачуе, дык прыдумае. А ўжо пад настрой...

Калі ён добры, Захаравіч абавязкова нешта змарозіць, і мы пасмяёмся, калі дрэнны, — хавайся ў бульбу, як той казаў, бо мала не падасца.

Не так даўно ён, прынамсі, рэкламістам «падкінуў». Тыя чарговую панацэю прапаноўвалі: казалі, што кожны можа страціць твар падчас *стрэсу*...

Дзед пачуў «падчас *сексу*».

— Во, — крычаў, — ужо і гэта будуць «адсочваць», камеры назірання паставяць...

Каб што лепшае.

## Іншыя — і часы, і норавы

Раніца, прыпынак, натоўп. Міма яго крочаць двое: п'яны, можна сказаць, дзяцюк за ручку вядзе малую. Яму — недзе пад трыццаць, дзяўчынцы — каля сямі.

Гадоў колькі таму ў людзей ніякіх бы думак: бацька (ну які ўжо ёсць) выпіў ці пахмяліўся, але ж пры памяці — вядзе ў школу дачку.

Сёння, столькі ўсяго начытаўшыся, з жахам думаеш: а што, калі гэта — не бацька?

Не дачку?

Не ў школу?

## Хто ёсць хто?

У Танечкі дом вялікі: жыхароў ды жыхарак — безліч, але ж новую прыкмеціла ўсе, бо яна неяк не так, не па-нашаму, апранаецца, штораніцу робіць прабежкі, а галоўнае — так шчыра ўсміхаецца, заўсёды, усім...

«Альбо хворая, альбо замежніца», — прызналі суседзі.

...Як у ваду паглядзелі — немка.

## Залаты ўзрост!

Пуста, мякка кажучы, у крамах *жаночага* адзення. Што ўжо казаць пра мужчынскае: там нават цікаўных вобмаль. А зрэшты, здаецца, не?

Да аднаго з кранштэйнаў кіруе статны малады пенсіянер, прыглядаецца да пінжакоў, да цэннікаў — нешта выбірае. Потым азіраецца навокал, побач з люстэркам, што тут жа, у зале, здымае куртку — ускідвае на плечы пінжак. «Не яго гардэробчык», — думаем мы, бо рэч хутчэй маладзёжная, да таго ж — трохі вузкаватая ў плячах, у грудзях...

Прадавачкі лічаць інакш (ці заробак свой адрабляюць?):

— Во, як на вас пашыты, — кажа адна.

— І да твару вам, — тут жа дадае другая. — Бярыце — не пашкадуеце: надзенеце, — усе дзеўкі вашы!

— Ды божа барані! — адмаўляецца мужчына. — Не той узрост у мяне: дурата, дзякуй богу, прайшла, а маразм яшчэ не наступіў.

## Сто дваццаць два баравікі

Хат такіх у вёсках мільён: некалі з горам, з бядой яны будаваліся, потым доўга служылі, а ўрэшце...

Гэта вось гадоў з пяць пуставала, пакуль знайшоўся чалавек — купіў пад дачу.

Доўга шчыраваў — даводзіў да ладу: мяняў вокны-дзверы, вялікую печ — на камін, «падымаў» столі, фарбаваў, абшываў...

І тады, што называецца, сем разоў на дні прыбягаў да суседа — дзеда Мацвеевіча: то каб нейкага рыштунку пазычыць, то параіцца, то вады з яго студні набраць...

Потым, калі абжыўся, бегаць перастаў: хіба вітаўся заўжды і яшчэ здалёк.

Але ж крыўды на яго Мацвеевіч не трымаў — амаль: яна грызла хіба тады, калі новы сусед на досвітку заводзіў машыну, ехаў у грыбы, а яго — такога аматара — з сабою не браў.

Чаму? Ды зразумела ж: хворы на ногі, стары — з ім не разгонішся, не пагойсаеш, шмат не назбіраеш. І ў лесе не кінеш, бо сам ён дамоў не дойдзе...

Значыць, лепей яго не браць — хадзіць па... дзедавых мясцінах (той сам паказаў, адразу ж)...

Дачнік вось так і рабіў: ездзіў у лес, вяртаўся, часам расказваў, колькі чаго знайшоў.

— Глядзі: адзін у адзін... Сто дваццаць два баравікі! — пахваліўся ў той дзень ды, шчаслівы, пайшоў у хату парадкаваць.

На двор не выходзіў гадзіны са дзве (ганак ягоны ў дзеда ў вакне). Потым — выскачыў, узбег на склеп, стаў размаўляць па мабільным (там чутнасць лепшая), можа, нават баравікамі хваліцца... «Ну і няхай», — падумаў Мацвеевіч.

Але ж хутка ўнюхаў, што ад дома суседа пацягнула... гарэлым. А прыгледзеўся — і не чуючы ног кінуўся з хаты.

— Браток, гарыш! — крыкнуў дачніку.

Той куляй панёсся ў хату.

Следам «прыбег» і дзед. Агонь, дзякуй богу, паспелі патушыць. Потым разам убачылі, што згарэла каструля, дзе варыліся сто дваццаць два баравікі, што ад яе, відаць, загарэўся ручнік, што ляжаў на блізкай патэльні, задымела абшыўка сцен... Карацей, калі б не Мацвеевіч...

З той вялікай удзячнасці дачнік зноў заходзіць да дзеда: то гасцінцаў якіх прывязе, то дроў у хату наносіць.

Можа, і ў грыбы часам возьме...

Калі дзед дажыве.

## Напісанае — застаецца

...У вёсках Ушаччыны, паводле ўспамінаў Барадуліна, цікавая гульня была. Бацькі, каб крыху пацішэла ў хаце, казалі дзецям: «Збегайце да Музыканціхі, вазьміце ў яе пахадні».

Малыя беглі ў крайнюю хату, казалі: так і так, маўляў, маці прасіла забраць пахадні. А там ужо ведалі, што гэта проста забава, і пасылалі іх да Мікіціхі, Мікіціха затым — да Піліпіхі... Глядзіш, малыя ўсю вёску аббегаюць — на паветры набудуцца, стомяцца — спяць пасля, як снапкі...

Вось такая гульня была.

Вось такія кабеты — замужнія: за музыкантам, Мікітам, Піліпам...

Былі яны ды пайшлі ў лепшы свет... Як і большасць малых дуронікаў, што бегалі ад хаты да хаты...

У вёсках, якіх, таксама, відаць, не стала?

**Валянціна ДОЎНАР**

■

■ Прававая гасцёўня

# Таямніцу ўсынаўлення можа адкрыць толькі сам усыноўлены

***Мой бацька — прыёмны сын у сваіх бацькоў (маіх бабулі і дзядулі). Ці маю я права даведацца, хто яго біялагічныя бацькі, гэта значыць мае кроўныя бабуля і дзядуля? Ці не супярэчыць гэта таямніцы ўсынаўлення? Калі такое права замацавана заканадаўствам і куды мне звяртацца?***

**Дар'я К.**, *г. Мінск*



На пытанне адказвае **Алена СЕМЯНЮК, кансультант упраўлення натарыята і загсаў Міністэрства юстыцыі Беларусі:**

— Атрымаць звесткі пра ўсынаўленне вашага бацькі можа толькі асабіста ён. Ніякім іншым асобам такая інфармацыя, згодна з заканадаўствам, не даецца.

Пасля ўсынаўлення паміж усынавіцелем (усынавіцелямі) і яго (іх) сваякамі з аднаго боку і ўсыноўленым дзіцем з другога ўзнікаюць такія ж правы і абавязкі, як і паміж бацькамі і дзецьмі, а таксама іх сваякамі па паходжанні. Усыноўленае дзіця фактычна і юрыдычна становіцца членам сям'і ўсынавіцеляў, лічыць іх сваімі кроўнымі сваякамі. Менавіта з гэтай прычыны таямніца ўсынаўлення ахоўваецца законам.

Пытанні таямніцы ўсынаўлення рэгламентуюцца ў артыкуле 136 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і (далей — Кодэкс). Згодна з ім, суд, які вынес рашэнне аб усынаўленні дзіцяці, службовыя асобы, якія здзейснілі рэгістрацыю ўсынаўлення, а таксама асобы, тым ці іншым чынам праінфармаваныя пра ўсынаўленне, абавязаны захоўваць таямніцу ўсынаўлення дзіцяці.

Паведамляць якую-небудзь інфармацыю, выдаваць копіі рашэнняў суда, дакументы і (ці) даведкі, дзе змяшчаюцца звесткі з запісаў актаў грамадзянскага стану, па якіх можна зразумець, што ўсынавіцелі не з'яўляюцца кроўнымі бацькамі ўсыноўленага, забараняецца. Дазвол на такія дзеянні можна атрымаць са згоды ўсынавіцеляў, а ў выпадку іх смерці — са згоды органаў апекі і папячыцельства.

Усынаўленне як юрыдычны акт параджае прававыя наступствы, пра што сведчыць артыкул 134 Кодэкса. Усыноўленыя дзеці і іх патомства ў дачыненні да ўсынавіцеляў і іх сваякоў прыраўноўваюцца ў асабістых немаёмасных і маёмасных правах і абавязках да сваякоў па паходжанні. Разам з тым малыя, якіх усынавілі, губляюць асабістыя немаёмасныя і маёмасныя правы і вызваляюцца ад абавязкаў у дачыненні да сваіх бацькоў (сваіх сваякоў).

Усыноўленае дзіця па дасягненні свайго паўналецця (18 гадоў) або ў выпадку набыцця дзеяздольнасці ў поўным аб'ёме мае права атрымаць звесткі пра сваё ўсынаўленне. Для гэтага яму трэба звярнуцца ў суд, які вынес рашэнне аб усынаўленні. Пра сваё ўсынаўленне чалавек можа даведацца таксама, звярнуўшыся па месцы знаходжання запісу акта аб усынаўленні ці ў орган апекі і папячыцельства па месцы жыхарства ўсынавіцеляў.

***Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста і іншых устаноў мы будзем шукаць на іх адказы***

■

# ТРЭНДЫ ДАВОСА




## Якія глабальныя тэндэнцыі агучаны на Сусветным эканамічным форуме?

**У занесеным снегам альпійскім мястэчку Давос сусветная палітычная і бізнес-эліта на мінулым тыдні абмяркоўвала найважнейшыя пытанні развіцця эканомікі і шукала шляхі да лепшай будучыні. Тут прайшоў чарговы, 48-ы па ліку, Сусветны эканамічны форум (СЭФ). Галоўны яго пасыл — стварэнне новага «сацыяльнага кантракта». Заклік да гэтага прагучаў ад самога заснавальніка СЭФ, нямецкага эканаміста Клауса Шваба, паведаміў forbes.ru. На думку эксперта, свет перажыў фінансавы крызіс, але ўступіў у сацыяльны, і многім краінам неабходная дапамога, каб навучыцца жыць у новых рэаліях. Адным з ключавых выклікаў нашага часу навукоўцы лічаць павелічэнне разрыву паміж багатымі і беднымі дзяржавамі. Якія яшчэ глабальныя тэндэнцыі, здольныя паўплываць на наша жыццё ўжо ў найбліжэйшыя гады, згадваліся ў Давосе?**

### Галоўная сыравіна — інфармацыя

Кіраўнік Міжнароднага валютнага фонду Крысцін Лагард выказала аптымізм у адносінах да глабальнай эканамічнай сітуацыі. Паводле яе слоў, свет перажывае «светлы момант», а эканоміка будзе развівацца на поўнай магутнасці, прынамсі, у наступныя два гады. МВФ нават палепшыў прагнозы па росце глабальнага ВУП да 3,9 працэнта ў 2018-м і 2019-м. Такія змены магчымыя за кошт падатковай рэформы ў ЗША, а таксама актывізацыі міжнароднага гандлю і інвестыцый. Самай хуткарослай эканомікай свету застанецца Індыя з прагнозай дынамікай у 7,4 працэнта.

Крыху менш аптымістычных поглядаў прытрымліваецца прэзідэнт Сусветнага банка Джым Ён Кім. Паводле афіцыйнай справаздачы СБ, сёлета рост валавога ўнутранага прадукту ў краінах з развітой эканомікай крыху знізіцца — да 2,2 працэнта, паколькі цэнтрабанкі паступова будуць «расчышчаць» посткрызісны эфект, у сваю чаргу, рост інвестыцый стабілізуецца. «Плюс» у краінах, якія развіваюцца, і на новых рынках у 2018 годзе ўзмоцніцца да 4,5 працэнта. Гэта абумоўлена актывізацыяй дзейнасці экспарцёраў сыравінных тавараў на фоне павышэння цэн.

Еўрапейскія лідары, якія прысутнічалі на форуме, удзялілі вялікую ўвагу лічбавай эканоміцы, паабяцаўшы накіраваць максімум намаганняў на яе развіццё. Канцлер ФРГ Ангела Меркель адзначала, што інфармацыя становіцца галоўнай сыравінай XXI стагоддзя і ствārae сур'ёзныя выклікі для сусветнай супольнасці — ад эканамічнай інклюзіўнасці да пытанняў асабістай прасторы. «Еўрасаюз будзе рухацца ў бок «адзінага лічбавага рынку», — канстатавала нямецкі лідар. Прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон, у сваю чаргу, заявіў, што мае намер зрабіць інавацыі цэнтральнай часткай французскай эканомікі — на працягу пяці гадоў краіна будзе штогод інвеставаць $15 млрд у адукацыю і $10 млрд — у навуковыя даследаванні.

Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тэрэза Мэй падтрымала еўрапейскіх калег. Яна згадала гісторыю пра тое, як робат выратаваў двух хлопчыкаў у моры, скінуўшы ім надзіманы матрац, і адзначыла, што дзякуючы тэхналогіям можна, напрыклад, на трэць знізіць колькасць захворванняў на рак малочнай залозы. Па словах Мэй, Вялікабрытанія ўжо распрацоўвае лічбавую хартыю, у аснове якой ляжыць набор пэўных прынцыпаў. Пры гэтым тэхналагічнае развіццё нясе ў сабе не толькі перавагі і магчымасці, але і пагрозы, якія, па словах Мэй, павінны быць падзелены разам з тэхналагічнымі кампаніямі і інвестарамі.

### Тры рызыкі і тры пагрозы

Сёлета Еўропа нарэшце можа завяршыць стварэнне больш гнуткага валютнага саюза. Але не варта губляць пільнасці. Генеральны сакратар Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця Анхель Гурыя заўважыў з гэтай нагоды: «Наш галоўны вораг — самазадаволенасць. Усе кажуць пра аднаўленне эканомікі, хтосьці — нават пра бум. Але мы зараз толькі пачынаем апраўляцца пасля дзесяцігадовага крызісу. Мы рухаемся не з крэйсерскай хуткасцю, як гэта было да крызісу. Тады рост эканомікі складаў чатыры працэнты. Мы выдаткавалі мільёны і мільёны на тое, каб выйсці з сітуацыі, якая склалася. І цяпер нам трэба вярнуць гэтыя грошы. Трэба шмат працаваць».




На думку прэм'ер-міністра Індыі Нарэндры Модзі, змяненне клімату, тэрарызм і страх перад глабалізацыяй — тры галоўныя рызыкі на шляху развіцця цывілізацыі. Некаторыя краіны занадта сфакусаваны на сваім парадку дня, у той час як існуе шэраг эканамічных і сацыяльных пытанняў, якія патрабуюць сумеснага вырашэння. «Тэрарызм небяспечны, але нават больш небяспечнае штучнае адрозненне, створанае паміж «добрымі» і «дрэннымі» тэрарыстамі», — заявіў Модзі.

Галоўны канкурэнт Індыі ў Ціхаакіянскім рэгіёне, Кітай, на працягу найбліжэйшых трох гадоў мае намер засяродзіцца на барацьбе з трыма пагрозамі: фінансавымі рызыкамі, беднасцю і забруджваннем навакольнага асяроддзя. Эканамічны саветнік Лю Хэ, які ўзначаліў кітайскую дэлегацыю ў гэтым годзе, заявіў, што КНР працягне павышаць прывабнасць фінансавага рынку краіны для замежнікаў у рамках праграмы «Адзін пояс, адзін шлях». Праект, які ахоплівае звыш 60 краін на ўсіх населеных кантынентах свету, з інвестыцыйным партфелем амаль у трыльён долараў інакш як глабальным не назавеш.

Прэм'ер-міністр Нарвегіі Эрна Солберг падкрэсліла, што сусветнай супольнасці варта засяродзіцца на пытаннях карупцыі і незаконных грашовых патокаў: «Неабходна змагацца з «падатковымі гаванямі», якія перашкаджаюць размеркаванню рэсурсаў і прыбыткаў». Гэта насамрэч застаецца глабальнай праблемай — паводле апошняга даклада Рымскага клуба, у афшорах схавана да 30 трыльёнаў долараў.

### Чаканні і расчараванні

Пры ўсім натхненні грамадства лічбавізацыяй удзельнікі СЭФ адзначылі пэўнае расчараванне ў тэхналогіях, якія яшчэ нядаўна абяцалі ўсім «цудоўны новы свет» і ўзбагачэнне. Завышаныя чаканні ад развіцця тэхналогій, якія могуць прывесці да расчаравання, пытанне працаўладкавання ў будучыні, звязанае з аўтаматызацыяй працоўных месцаў, а таксама крызіс сістэмы адукацыі і аховы здароўя — праблемныя пункты, якія былі вызначаны Сусветным банкам. Даследаванне, праведзенае гэтай арганізацыяй, паказала, што, калі людзі падключаюцца да інтэрнэту і сацыяльных сетак, — яны бачаць, як растуць даходы іншых, і пачынаюць чакаць павышэння ўласнага заробку. «З аднаго боку, гэта матывуе, але, з другога боку, чаканні не заўсёды спраўджваюцца і ў такім выпадку прыводзяць да расчаравання. Тады ёсць рызыка ўзнікнення канфліктаў, экстрэмізму і міграцыі», — пракаментаваў вынікі даследавання Ён Кім.

Па некаторых даных, да 2025 года каля 8 мільярдаў чалавек атрымаюць доступ да інтэрнэту, і эфект ад такога глабальнага падключэння нясе вялікія рызыкі стабільнасці свету, калі краіны не будуць гатовыя да гэтага. Асобную пагрозу ўяўляе манапалізацыя рынкаў буйнымі ІТ-кампаніямі. Чым больш яны развіваюць тэхналогіі штучнага інтэлекту і ўкараняюць іх у сваю дзейнасць, тым больш рэгуляваным становіцца інтэрнэт (браўзеры, сацыяльныя сеткі), што, у сваю чаргу, ставіць пад удар асабістую прастору карыстальнікаў і магчымасць непрадузятага пошуку інфармацыі. Таксама выклікае апасенні будучая біятэхналагічная і генетычная рэвалюцыя, якая абяцае «ўзлом» геному і магчымасць праграмаваць «неабходнае грамадства». Цэлы шэраг сесій СЭФ быў прысвечаны менавіта гэтай тэме.

Тэза «вашы даныя — гэта вашы даныя» сёння больш не адпавядае рэчаіснасці. Інфармацыя, якую прадуцыруюць людзі, карыстаючыся камп'ютарамі і мабільнымі тэлефонамі, больш ім не належыць. Пра гэта на Сусветным эканамічным форуме ў Давосе сказаў кіраўнік Bharti Enterprises Суніл Бхарці Мітал. «Даныя людзей больш не належаць ім. Яны абляталь свет за лічаныя секунды. Гэта адбываецца пастаянна. Але права, якое людзям павінна быць гарантавана, — гэта права мяняць правайдара, права перакладваць свае даныя з аднаго сервера на іншы, мець пэўны ўзровень кантролю. Але забяспечыць поўнае права ўласнасці на даныя вельмі складана», — сказаў Мітал. У сваю чаргу гендырэктар IBM Вірджынія Рамеці заўважыла, што валодаць данымі як рэсурсам недастаткова. Як і ў выпадку з любым прыродным рэсурсам, для эфектыўнага выкарыстання вялікіх даных патрэбныя веды і навыкі. Раней у Давосе гендырэктар IBM заклікала распрацаваць кашталінасці для свету машын і людзей.

### Жарсці па блокчэйне

Летась у Злучаных Штатах 750 амерыканцаў заплацілі падаткі ў біткойнах. На форуме адзін з галоўных экспертаў свету па крыптавалюце, аўтар бестселера «Рэвалюцыя блокчэйна» Дон Тапскот, прадставіў карту свету з 14 краінамі — лідарамі па ўкараненні тэхналогіі блокчэйн. У гэты пералік увайшлі ЗША, Канада, Бразілія, Аўстралія, Ізраіль, ААЭ, Грузія, Эстонія, Вялікабрытанія, Украіна, Францыя, Германія, Швецыя і Кітай.

Пытанне майнінгу крыптавалют цесна звязана з праблемай кліматычнага ўрэгулявання, якая ўжо не першы год выклікае вялікую заклапочанасць сусветнай эліты ў Давосе. Па даных навукоўцаў, расход электраэнергіі для майнінгу біткойну і іншых крыптавалют за апошні год патроіўся і дасягнуў 37 гігаватгадзін у дзень. Для выпрацоўкі такой колькасці энергіі спатрэбіцца каля 30 ядзерных рэактараў магутнасцю 1,2 гігавата. Такім чынам, майнінгавая дзейнасць моцна награвае планету і можа вельмі негатыўна адбіцца на прыродных умовах. «Калі ўсё працягнецца ў тым жа духу, то ў 2018 годзе гэтая сістэма будзе спажываць столькі ж электрычнасці, колькі ўся Аргенціна. Гэтая сітуацыя выклікае занепакоенасць», — заявіла кіраўнік Міжнароднага валютнага фонду Крысцін Лагард.

Сваю пазіцыю ў дачыненні да крыптавалют агучылі і прадстаўнікі КНР. «Лічбавыя грошы не з'яўляюцца канвертоўнай валютай. Іх рэальная каштоўнасць для эканомікі яшчэ павінна быць даказаная. У гэтым сэнсе мы не хочам, каб крыптавалюты сталі занадта значнымі і шырока таргаваліся ў Кітаі», — пракаментаваў сітуацыю адзін з ключавых фінансавых стратэгаў, намеснік старшыні Камісіі па рэгуляванні каштоўных папер КНР Фанг Ксінгхай.

### «Зялёная» эра

Апошнія тэндэнцыі на энергетычных рынках паказваюць, што свет усё хутчэй пераходзіць ад традыцыйнай энергетыкі да альтэрнатыўнай — «зялёнай» энергіі. Так, сонечная энергія становіцца самым танным рэсурсам для многіх краін свету і спаборнічае з традыцыйнай энергетыкай. Краіны змяняюць напрамак сваёй палітыкі ў бок аднаўляльнай, чыстай энергетыкі. Прагназуецца, што да 2040 года свету будзе неабходна на 30 % больш энергіі, чым у 2018-м, аднак гэта не будзе рэзкім скачком у спажыванні, а хутчэй паступовым нарастаннем патрэб. Пры гэтым неабходныя ўсе крыніцы энергіі. Назіраецца ажыўленая тэндэнцыя, калі спажыўцы становяцца яе вытворцамі, самастойна выкарыстоўваючы альтэрнатыўныя крыніцы энергіі. Такім чынам яны становяцца незалежнымі, самастойна кантралююць колькасць спажыванай энергіі. Таму краіны, якія экспартуюць нафту і газ, будуць паступова губляць сваіх спажыўцоў і, адпаведна, прыбытак.

Карпарацыйны попыт на «зялёную» энергію штурхае наперад працэс трансфармацыі ў сьвеце энергетыкі. Эра выкапняў, цэнтралізаваных крыніц энергіі не скончылася, але свет рухаецца ў гэтым кірунку. Пра гэта на Сусветным эканамічным форуме сказала выканаўчы дырэктар ініцыятывы ААН «Надзейная энергія для ўсіх» Рэйчэл Кот. «Пераходны перыяд дакладна ў разгары. Бізнес розных кірункаў — ад цяжкай прамысловасці да харчовай — зацікаўлены і імкнецца купляць больш "зялёнай" энергіі», — сказала яна. На думку эксперта, пераломным для «зялёнай» энергетыкі стане 2027 год.

### Жорсткая перазагрузка

Паводле даных штогадовага апытання міжнароднага аб'яднання арганізацый па барацьбе з беднасцю Oxfam, агучанага напярэдадні форуму ў Давосе, з 2010 года сукупны капітал мільярдэраў павялічыўся на 13 %. Іх даходы ў сярэднім раслі ў шэсць разоў хутчэй, чым даходы радавых работнікаў. «Бум мільярдэраў сведчыць не аб квітнеючай эканоміцы, а аб краху эканамічнага парадку», — заявіла выканаўчы дырэктар Oxfam Віні Б'яніма. Яна падкрэсліла, што ўплыў буйнога бізнесу настолькі ўзрос, што ён стаў уздзейнічаць на прыняцце многіх дзяржаўных рашэнняў. Генеральны дырэктар Oxfam Марк Голдрынг растлумачыў, што даследаванне заснавана на правераных і неабвержных доказах, і падкрэсліў, што «па меры набліжэння да высноў вы ўяўляеце, што няроўнасць у свеце дасягнула непрымальнага ўзроўню».

Няроўнасць няўхільна вядзе да росту напружанасці. Гендырэктар расійскага Цэнтра палітычнай інфармацыі Аляксей Мухін заявіў, што з-за нявырашаных пасля крызісаў праблем сусветная эканоміка можа стаць «эканомікай вайны», паведаміла РІА Навіны. Так эксперт пракаментаваў вынікі форуму ў Давосе. На яго думку, напярэдадні крызісаў 1998-га і 2008 года перад глабальнай эканомікай сталі праблемы і выклікі, якія ў выніку аказаліся «нявырашальнымі і нявырашанымі». Мухін заявіў, што вядучыя дзяржавы не прапанавалі вырашэння праблем, таму «перазагрузіць сістэму» можа вайна, але не «прамая, гарачая вайна», а «эканоміка вайны».

**Захар БУРАК.**

■ Асобы



# ІМЁНЫ, ЯКІМІ МЫ ГАНАРЫМСЯ

## Таксіст — Далідовіч, прававед — Домрачава, бізнесвумен — Цупер і твар гадзіннікавага брэнда — Кушнір. Чаго вы не ведалі пра беларускіх алімпійцаў

**Хто яны? Людзі, якія менш чым праз тыдзень выйдуць на алімпійскі стадыён Пхёнчхана і на працягу 20 дзён будуць прадстаўляць нашу краіну на сусветнай арэне. Сёння мы сабралі шматлікія факты пра нашых спартсменаў, каб вы даведаліся пра беларускіх алімпійцаў крыху больш.**

### ДАР'Я ДОМРАЧАВА



• Самая тытулаваная беларуская спартсменка ў гісторыі зімовых Алімпійскіх гульняў, а таксама першая біятланістка ў свеце трохразовая алімпійская чэмпіёнка.

• Нарадзілася ў Мінску ў сям'і архітэктараў. Праз чатыры гады разам з бацькамі пераехала ў Сібір, у горад Нягань, які толькі пачынаў будавацца.

• У дзяцінстве займалася танцамі і баскетболам, а потым разам са старэйшым братам прыйшла ў секцыю лыжных гонак.

• Скончыла гімназію, дзе вучылася ў эканоміка-прававым класе.

• Мае дзве вышэйшыя адукацыі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта.

• На пачатку кар'еры Домрачава выступала за Расію, але ў 2004 годзе кіраўнік Саюза біятланістаў Расіі Аляксандр Ціханаў абвясціў аб бесперспектыўнасці Дар'і і даручыў адлічыць яе са зборнай.



• Двухразовая чэмпіёнка свету (2012 і 2013), уладальніца Кубка свету ў сезоне 2014/2015, уладальніца 5 малых Хрустальных глобусаў Кубка свету.

• У дзень заваёвы трэцяга залатога медаля на Гульнях-2014 Дар'і было прысвоена званне «Герой Беларусі», яна стала першай у гісторыі краіны жанчынай, якая атрымала найвышэйшую ўзнагароду.

• Улетку 2015 года спартсменка перанесла вострае вірусное захворванне — монануклеёз, пасля чаго працягнула трэніравацца.

• Праз год, летам 2016-га, з сацыяльных сетак стала вядома, што Дар'я выйшла замуж за нарвежскага біятланіста Уле-Эйнара Б'ёрндалена (васьміразовы алімпійскі чэмпіён), невялікае вяселле прайшло ціха на радзіме мужа Домрачавай.

• У кастрычніку 2016 года спартсменка нарадзіла дачку — Ксенію. Характэрна, што для родаў Дар'я не выбрала замежную медыцынскую ўстанову, дачка знакамітых спартсменаў з'явілася на свет у 6-м радзільным доме Мінска.

• Пасля нараджэння дзіцяці Домрачава хутка вярнулася ў вялікі спорт, узяўшы «серабро» на чэмпіянаце свету 2017 года.

• У цяперашнім сезоне тройчы ўздымалася на п'едэстал этапаў Кубка свету — у Хохфільцэне выйграла спрынтарскую гонку, у Антхольцы ўзяла «бронзу» ў праследзе і «золата» ў мас-старце.

### СЯРГЕЙ ДАЛІДОВІЧ



• Рэкардсмен беларускай каманды па ўдзеле ў Алімпійскіх гульнях. Для Далідовіча Гульні ў Пхёнчхане — сёмыя. Больш за яго ў «белых» Алімпіядах удзельнічалі толькі два спартсмены — расійскі саначнік Альберт Дземчанка і легендарны японскі скакун з трампліна Нарыякі Касаі.

• Нарадзіўся ў Оршы.

• У дзяцінстве займаўся футболам, гуляў у адной камандзе з вядомым беларускім футбалістам, а пазней трэнерам Пятром Качурам.

• У шаснаццаць гадоў стаў пераможцам усесаюзных спаборніцтваў, тады Сяргей бег у чужым камбінезоне, чужым абутку і з чужымі палкамі, толькі лыжы былі свае.



• У часы, калі былі фінансавыя складанасці, Сяргей таксаваў: «Браў жонку, каб было спакайней, выязджалі і зараблялі пяць-дзесяць долараў. Гэта вясёлае жыццё, якое ўспамінаю з задавальненнем. Памятаю час, калі мы прыходзілі ў кафэ са сваімі пельменямі. Заказвалі нейкія напоі, давалі пачак пельменяў — і нам іх варылі».

• Далідовіч дэбютаваў на Алімпіядзе ў 1994-м, тады яму быў 21 год.

• Самы дарослы ў цяперашняй алімпійскай камандзе, зараз Далідовічу 44 гады.

• У сакавіку 2001 года атрымаў сваю першую і адзіную перамогу на этапе Кубка свету.

• За сваю кар'еру прымаў удзел у 12 запар чэмпіянатах свету (1995—2017), на якіх выходзіў на старт у 34 дысцыплінах. Найлепшы вынік — 4-е месца ў скіятлоне на 30 км на чэмпіянаце свету 2011 года ў Халменколене.

• У 2017 годзе абвясціў аб тым, што завяршае кар'еру, але крыху пазней вырашыў, што хоча працягнуць выступленне і прыняць удзел у Алімпіядзе-2018. Спартсмен ужо не ўваходзіў у склад нацыянальнай зборнай, таму прыняў рашэнне самастойна рыхтавацца да Гульняў. Для гэтага абвясціў пра збор сродкаў на краўдфандынгавай пляцоўцы «Талака». Сабраў усю неабходную суму і нават крыху больш. Падрабязную смету расходаў спартсмен публікаваў на сваіх старонках у сацсетках.

• Сяргей Далідовіч з'яўляецца бацькам траіх дачок.

### АНТОН КУШНІР



• Нарадзіўся ў Чырвонаармейску (Ровенская вобласць, Украіна), з 2002 года жыве і трэніруецца ў Мінску.

• Удзельнік Алімпійскіх гульняў 2006, 2010 і 2014 гадоў. У Ванкуверы Антон быў адным з фаварытаў, у кваліфікацыі лідзіраваў пасля першага скачка, але ў другім адшпіліліся лыжа, няўдалае прызямленне і толькі 21-ы вынік.

• На Алімпіядзе ў Сочы ў фінале Антон рызыкнуў і выйграў. Ён выканаў самы складаны скачок — трайное сальта з пяццю піруэтамі, прычым у самай нязручнай варыяцыі: два вінты — вінт — два вінты. «Памятаю, што той дзень быў доўгі, напружаны сам па сабе. Перад трэніроўкай адчуваў мандраж, страх. Але, калі прыехалі на схіл, усё прайшло. Я стараўся не думаць пра лішнія моманты, канцэнтраваўся на рабоце, важных дэталях, і ўсё атрымалася».

• Уладальнік Кубка свету 2009/2010 (выйграў 4 этапы з 6, адзін раз заняў другое месца і адзін раз трэцяе), сярэбраны прызёр агульнага заліку Кубка свету 2007/2008, бронзавы прызёр чэмпіянату свету 2011 года.



• Пасля перамогі на Алімпіядзе стаў тварам гадзіннікавага брэнда «Прамень».

• Перанёс некалькі аперацый да алімпійскай перамогі ў Сочы і яшчэ адну пасля яе.

• У цяперашнім сезоне ўздымаўся на п'едэстал на чатырох з шасці этапах Кубка свету — «золата» ў Маскве, «серабро» ў Лэйк-Плэсідзе і дзве «бронзы»: у кітайскім Сакрэт-Гардэне і амерыканскім Дзір-Вэлі.

• Бацька траіх дзяцей.

### АЛА ЦУПЕР



• Нарадзілася ў горадзе Роўна (Украіна).

• Скончыла Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці «трэнер-выкладчык».

• Пазнаёмілася з будучым мужам у трэнажорнай зале.

• У 33 гады спартсменка нарадзіла першае дзіця і на паўтара года спыніла трэніроўкі, прызнаецца, што ў спорт яе вярнуў муж.

• Вольны час любіць праводзіць на рыбалцы, захапляецца вязаннем.

• Шматразовая пераможца этапаў Кубка свету.

• Удзельніца пяці запар зімовых Алімпіяд (1998, 2002, 2006, 2010, 2014).

• На Гульнях у Сочы, дзе стала алімпійскай чэмпіёнкай, Цупер з цяжкасцю прайшла кваліфікацыю. У трэцім вырашальным фінале ўдала выканала свой скачок бэк-фул-фул-фул, атрымаўшы 98,01 бала. Усе тры канкурэнткі, якія выступалі пасля яе, сарвалі свае скачкі.



• Медаль Цупер стаў першым для Беларусі ў жаночым фрыстайле.

• Пасля Алімпіяды-2014 Цупер адкрыла свой бізнес — краму італьянскай пліткі ■

■ Чулі?

# «Белыя» Гульні не абыдуцца без экзотыкі

## На зімовай Алімпіядзе выступяць спартсмены з Кеніі, Нігерыі, Тонга

**А таксама Малайзія, Сінгапур, Эквадор, Эрытрэя і Косава, якія ніколі не ўдзельнічалі ў папярэдніх зімовых гульнях, уваходзяць у лік 92 краін — удзельніц Алімпіяды-2018.**

Напэўна, аматары спорту, якія пільна сочаць за алімпійскім рухам, памятаюць, як на адкрыцці Гульняў-2016 у Рыа-дэ-Жанейра на алімпійскім стадыёне «Маракана» з'явіўся хлопец з голым торсам, абмазаны какосавым маслам. Гэта Піта Тауфатофуа, тэквандыст з Тонга (палінезійскае каралеўства, якое складаецца з 170 астравоў у Ціхім акіяне).



Кажуць, тады ён не ведаў, што такое снег, а зараз мы даведваемся, што Піта прадставіць сваю краіну на зімовай Алімпіядзе ў Пхёнчхане. На гэты раз хлопец выбраў лыжныя гонкі. *«Я хацеў знайсці самы цяжкі від. Бо гэта шыкоўны выклік, шанц натхніць усю краіну: аказваецца, за год можна падрыхтавацца сябе да таго, што спачатку здаецца неверагодным. Я глядзеў розныя спаборніцтвы, але менавіта лыжнікі пасля кожнай гонкі літаральна паміраюць. Яны бягуць з дзіўным запалам, але як толькі фінішуюць — адразу падаюць на снег і спрабуюць прыйсці ў сябе. Мяне гэта ўразіла»*, — расказвае Піта.

Першыя трэніроўкі спартсмену з Тонга арганізавала медыя-каманда Міжнароднага алімпійскага камітэта. 1 студзеня 2017-га на канале Olympic Channel выйшаў жыццесцвярджальны ролік пра 33-гадовага мужчыну, які ўпершыню становіцца на лыжы. *«Ногі разыходзіліся ў розныя бакі, мяне трэсла. Гэта было выдатна для ТБ, але на самай справе я сядзеў і думаў: «Ува што я наогул увязаўся?»* — успамінаў Піта крыху пазней.

Пасля 4-тыднёвага збору ў Германіі ён прабег спрынт на чэмпіянаце свету ў Лахці. Вынік — 153-е месца са 156 удзельнікаў.

У Пхёнчхане на зімовых Алімпійскіх гульнях дэбютуе Нігерыя — жаночая зборная



па бабслеі. Сеун Адзігун, Нгозі Анвумерэ і Акуома Амеога сталі першымі спартсменкамі з Афрыкі (і сярод жанчын, і сярод мужчын), якім удалося адабрацца на Алімпійскія гульні ў бабслеі. Яны паспяхова выступілі ў пяці кваліфікацыйных заездах у спаборніцтвах экіпажаў-двоек — у Юце, Уістлеры і Калгары. Пілот экіпажа Адзігун — былая чэмпіёнка Афрыкі ў бегу на 100 м з бар'ерамі, удзельніца Алімпіяды-2012. *«Гэта велізарны крок наперад для спорту ў Нігерыі. Я ганаруся тым, што змагла адыграць ролю ў прасоўванні зімовых відаў спорту ў маёй краіне. Цяпер наша мэта — так выдатна прадставіць Афрыку на зімовай Алімпіядзе, як да нас яшчэ ніхто гэтага не рабіў»*, — расказала Сеун Адзігун.

Сродкі на падрыхтоўку спартсменкі знайшлі пры дапамозе краўдфандынга, сабраўшы больш за $75 тысяч. Яны размясцілі відэаролік, на якім станцавалі і праспявалі.

Малайзійскія спартсмены Джэфры Уэб і Джулян Йі прымуць удзел у гарналыжных спаборніцтвах і мужчынскім фігурным катанні адпаведна. Сінгапур будзе спаборнічаць у шорт-трэку. Эквадор адправіў аднаго спартсмена на бегавыя лыжы. Эрытрэя і Косава будуць прадстаўлены ў горных лыжах ■

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
20.01.2018 г.
Лихачевский В. В.

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
## ОБ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ДЕСЯТОГО ВЫПУСКА
## Закрытого акционерного общества «ТОПЗАПЭЛЕКТРО»

**1.** Полное и сокращенное наименование Эмитента (на русском и белорусском языках):

На русском языке:

полное наименование: Закрытое акционерное общество «Топзапэлектро» (далее по тексту – Эмитент), сокращенное наименование: ЗАО «Топзапэлектро».

На белорусском языке:

полное наименование: Закрытае акцыянернае таварыства «Топзапэлектра», сокращенное наименование: ЗАТ «Топзапэлектра».

**2.** Местонахождение Эмитента: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, ул. Карла Маркса, дом 25, пом. 12Н, почтовый адрес: Республика Беларусь, 220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 39-8Н, телефон: +375 (17) 338-16-15, факс: +375 (17) 318-79-48, e-mail: tze@tze.by, сайт: www.tze.by

**3.** Закрытое акционерное общество «Топзапэлектро» зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 14 сентября 2000 года № 1044 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100896485.

**4.** Денежные средства при проведении открытой продажи облигаций будут поступать на текущий (расчетный) счет Эмитента: BY20OLMP30120000826580000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X (г. Минск, ул. Притыцкого,60/2, УНП 100429079).

**5.** Депозитарий Эмитента – Закрытое акционерное общество «Минский транзитный банк» (ЗАО «МТБанк»), код депозитария 014, расположен по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, Толстого, 10. ЗАО «МТБанк» зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 14 марта 1994 года, регистрационный номер 38. Специальное разрешение (лицензия) №02200/5200-1246-1112 на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выдано Министерством финансов Республики Беларусь, срок действия бессрочно.

**6.** Согласно Общегосударственному классификатору Республики Беларусь «Виды экономической деятельности» ОКРБ 005-2011:

| Код | Наименование вида деятельности |
|---|---|
| 41200 | Общее строительство зданий |
| 71110 | Деятельность в области архитектуры |
| 68100 | Покупка и продажа собственного имущества |

**7.** Решение о 10 выпуске жилищных облигаций принято внеочередным общим собранием акционеров Закрытого акционерного общества «Топзапэлектро» от 23 ноября 2017 года, протокол №б/н, утверждено 20.12.2017 г. (протокол №б/н от 20.12.2017).

**8.** Форма и вид облигаций, объем выпуска облигаций, количество облигаций, номинальная стоимость облигации:

| | |
|---|---|
| Форма и вид облигаций | Жилищные, бездокументарные, именные, конвертируемые облигации (далее – облигация) |
| Объем выпуска | 3 375 900 (три миллиона триста семьдесят пять тысяч девятьсот) белорусских рублей |
| Количество облигаций | 5 115 (пять тысяч сто пятнадцать) штук |
| Номинальная стоимость одной облигации | 660 (шестьсот шестьдесят) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади помещения в Жилом доме № 21, входящего в состав Объекта строительства |

Эквивалент номинальной стоимости облигаций не подлежит изменению в течение срока обращения облигаций настоящего выпуска.

**9.** Цель эмиссии облигаций и направление использования средств, привлеченных путем эмиссии облигаций. Описание объекта строительства:

Цель эмиссии жилищных облигаций является привлечение денежных средств физических и (или) юридических лиц для осуществления строительства Жилого дома № 21, входящего в состав строящегося объекта – «Комплекс многоквартирных жилых домов с объектами торгового и общественного назначения по ул. Алибегова, ул. Я. Брыля». Четвертая очередь строительства. Жилые дома № 21 со встроенными помещениями, № 22 со встроено-пристроенными помещениями торгового и общественного назначения и автостоянка № 21а по г/п» (далее – Объект), в том числе для хозяйственной деятельности Эмитента, связанной с выполнением им функций заказчика (застройщика) по указанному Объекту строительства и возможностью временного размещения привлекаемых денежных средств на депозитные счета банков.

Денежные средства, полученные от размещения облигаций, будут использоваться Эмитентом в соответствии с целью их эмиссии.

9.1. Решением Минского городского исполнительного комитета от 07.07.2016 № 1932 предоставлены земельные участки ЗАО «Топзапэлектро» во временное пользование сроком до 01.08.2018 г. на период строительства Объекта, а также разрешено строительство данного Объекта.

9.2. Свидетельство (удостоверение) № 500/1393-7824 о государственной регистрации возникновения прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок (права временного пользования) от 30.08.2016 г. выдано РУП «Минское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

9.3. Архитектурный проект согласован Комитетом архитектуры и градостроительства Мингорисполкома (заключение № 12-28/1386М от 28.12.2015). Положительное заключение государственной экспертизы РУП «Главгосстройэкспертиза» по проектной документации Объекта от 07.04.2016 г. № 55-15/16).

9.4. Письмо РУП «Главгосстройэкспертиза» от 25.04.2016 г. № 01-09/1848.

9.5. Приказ Эмитента об утверждении проектной документации на строительство Объекта от 07.07.2016 № 41.

Нормативный срок продолжительности строительства – 24,5 месяца.

Предполагаемый срок сдачи в эксплуатацию Объекта 1 квартал 2019 года.

9.6. Проектируемый участок расположен в юго-западной части г. Минска в водоохранной зоне, частично в прибрежной полосе р. Мышка. Территория ограничена: с севера – свободной от застройки территорией, с юга – территорией детского сада и территорией многоквартирной жилой застройки (существующая, ЗАО «Топзапэлектро»), с запада – ул. Янки Брыля, с востока – существующей жилой многоэтажной застройкой.

